Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 301 (5975) | 30 снежня 1937 г., чацвер | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ—ПЯТНАЦЦАЦЬ ГОД З ДНЯ ЎТВАРЭННЯ СССР

НЯХАЙ ЖЫВЕ ВЯЛІКІ САЮЗ СОВЕЦКІХ СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК!

НЯХАЙ ЖЫВЕ ЛЕНІНСКА-СТАЛІНСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА!

НЕПАРУШНАЯ ДРУЖБА НАРОДАЎ СССР

Пройдуць вякі, але гістарычны дзень 30 снежня 1922 года вечна будзе жыць у сазнанні патомкаў народаў свету. З вуснаў у вусны будуць пераладавацца слаўныя старонкі гісторыі ўтварэння вялікага Совецкага Саюза.

Царская Расія была турмой народаў. У рабстве, нястачы, цемры і невуцтве пражывалі народы царскай Расіі. Падвойны гнёт — социяльны і нацыянальны — прыносіў найвялікшыя пакуты народам старой Расіі. Палітыка нацкоўвання адной нацыянальнасці супроць другой, культываванне варожасці і нянавісці паміж народамі вякамі праводзіліся царскімі апрычнікамі.

Толькі Вялікая Кастрычніцкая социялістычная рэволюцыя назаўсёды разбіла аковы нацыянальнай і социяльнай няроўнасці і вызваліла народы ад гнёту памешчыкаў і капіталістаў.

Вялікая дружба народаў, кіруемых партыяй Леніна—Сталіна, з'явілася адной з асноўных умоў, забяспечыўшых поўную перамогу на шматлікіх франтах грамадзянскай вайны супроць белагвардзейцаў і іншаземных інтэрвентаў.

Пасля выгнання інтэрвентаў задача заключалася ў тым, каб яшчэ больш зблізіць народы, насяляючыя краіну Совецаў, устанавіць яшчэ больш песнае брацкае садружаства. Ва ўвесь рост стала задача аб'яднання совецкіх рэспублік у адзіную совецкую дзяржаву.

Яшчэ напярэдадні I Усесаюзнага з'езда Совецаў воля народаў аб аб'яднанні была алналушна і ярка выказана на нацыянальных рэспубліканскіх з'ездах Совецаў, і за ажыццяўленне волі народаў, выкананне гэтай гістарычнай задачы ўзяўся вялікі Сталін. Геніяльнаму правадыру народаў, вялікаму і любімаму Сталіну, слаўнай большэвіцкай партыі народы нашай неабсяжнай радзімы абавязаны ўтварэннем СССР. Таварыш Сталін кіраваў I Усесаюзным з'ездам Совецаў. Ён з трыбуны Вялікага тэатра ў Маскве, дзе адбываўся з'езд, начартаў грандыёзную праграму работ вялікай Совецкай дзяржавы.

За 15 год існавання СССР, пад геніяльным кіраўніцтвам вялікага майстра, стратэга социялістычнага будаўніцтва таварыша Сталіна, на аснове ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі народы СССР прайшлі слаўны пераможны шлях. Агляніцеся навакол, і вы ўбачыце, як крыніцай б'е жыццё, як непазнавальна змяніўся воблік краіны. Новыя фабрыкі, заводы, гарады, чыгуначныя магістралі, рачныя каналы, квітнеючыя калгасы, саўгасы, універсітэты, школы, палацы апаясалі краіну Совецаў.

Дружнай сям'ёй, пад адным сцягам, сцягам партыі Леніна—Сталіна, шматлікія народы нашай радзімы — рабочыя, сяляне, інтэлігенцыя, — якія жывуць у абстаноўцы ўзаемнай дружбы, давер'я, брацтва, жывуць адными мэтамі, адными інтарэсамі, цвёрда і ўпэўнена ідуць да комунізма.

Дружба народаў СССР моцна, як граніт. Таварыш Сталін на Надзвычайным VIII Усесаюзным з'ездзе Совецаў, падрабязна спыніўшыся на пытанні аб дружбе народаў, аб моцнасці нашай шматнацыянальнай социялістычнай дзяржавы, сказаў:

«Адсутнасць эксплаататарскіх класаў, якія з'яўляюцца асноўнымі арганізатарамі міжнацыянальнай дракі; адсутнасць эксплаататацыі, якая культывуе ўзлемнае недавер'е і распальвае нацыяналістычныя страсці; наяўнасць ва ўладзе рабочага класа, які з'яўляецца ворагам усякага заняволення і верным носьбітам ідэй інтэрнацыяналізма; фактычнае ажыццяўленне ўзаемнай дапамогі народаў ва ўсіх галінах гаспадарчага і грамадскага жыцця; нарэшце, росквіт нацыянальнай культуры народаў СССР, нацыянальнай па форме, социялістычнай па зместу, — усе гэтыя і падобныя да іх фактары прызялі да таго, што змяніўся ў корані воблік народаў СССР, знікла ў іх пачуццё ўзаемнага недавер'я, развілося ў іх пачуццё ўзаемнай дружбы і наладзілася, такім чынам, сапраўднае брацкае супрацоўніцтва народаў у сістэме адзінай саюзнай дзяржавы».

Адсталыя ў мінулым нацыянальныя ўкраіны ператвораны ў квітнеючыя совецкія рэспублікі. Канулі ў вечнасць эксплаатацыя чалавека чалавекам, нястача, голад, беспрацоўе і жабрацтва, якія з'яўляюцца лёсам мільёнаў працоўных усіх нацыянальнасцей капіталістычных краін. У СССР пабудаван социялізм. Прамысловасць СССР пераўзыходзіць даваенную прамысловасць па аб'ёму вытворчасці ў 8 раз. У небывалых размерах вырасла прамысловасць у нацыянальных рэспубліках. Няма раздробленых сялянскіх гаспадарак, ёсць 243.000 калгасаў, багата аснашчоных першакласнымі сельскагаспадарчымі машынамі: трактарамі, камбайнамі, складанымі сельскагаспадарчымі машынамі.

Нябачанага ўздыму дасягла культура народаў СССР, нацыянальная па форме, социялістычная па зместу. У СССР у пачатковых і сярэдніх школах і ВНУ навучаецца больш 38 мільёнаў чалавек. У 700 вышэйшых навучальных установах вучацца дзеці ўсіх нацыянальнасцей. Толькі за 4 годы другой пяцігодкі было пабудавана ў сельскіх мясцовасцях 13.784 школы, у гарадах — 2.941 школа. Ажыццёўлена ўсеагульнае абавязковае навучанне. Усе народнасці СССР маюць магчымасць вучыцца на роднай мове. Усе гэтыя перамогі — рэзультат паспяховага ажыццяўлення мудрай ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Моц брацкага саюза народаў СССР выклікае шалёную злобу, нянавісць у ворагаў працоўных. Буржуазныя нацыяналісты разам з трацкістска-бухарынскарыкаўскімі шпіёнамі і дыверсантамі прабавалі падарваць магутнасць нашай краіны, забіць клін у дружбу народаў, пасеяць варожасць паміж нацыянальнасцямі, пасварыць нацыянальныя рэспублікі з вялікім рускім народам для таго, каб расчысціць шлях фашысцкім захватчыкам для ўварвання на нашу зямлю, для таго, каб адарваць нацыянальныя рэспублікі ад вялікага Совецкага Саюза, для таго, каб надзець ярмо памешчыкаў і капіталістаў на шыю рабочых і сялян.

Але каварныя козні ворагаў не ўдаліся і ніколі не ўдадуцца. Народы СССР, пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, вялікага Сталіна, пры дапамозе слаўных наркамунутдзельцаў выкрылі проіскі фашыстаў і іх подлай агентуры — нацыянал-фашысцкай падалі. Нікому і ніколі не ўдасца адняць у народаў СССР іх правоў, заваяваных і зацісаных у Сталінскай Канстытуцыі, не ўдасца адняць шчаслівае і радаснае жыццё.

Яркай дэманстрацыяй дружбы народаў, бязмежнага давер'я, любві і адданасці да партыі Леніна — Сталіна, да творца народнага шчасця таварыша Сталіна з'явіўся дзень 12 снежня, калі ўсе народы СССР дружнай, песнай сям'ёй, у адзіным парыве, у адзіным пачуцці гарачага совецкага патрыятызма прышлі на выбары дэпутатаў у Вярхоўны Совет СССР і галасавалі за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных. Гэтым самым яны яшчэ раз прадэманстравалі перад усім светам сваё палітычнае і маральнае адзінства вакол сцяга Леніна — Сталіна.

БССР — роўная сярод адзінаццаці Совецкіх Социялістычных Рэспублік вялікага Совецкага Саюза. БССР займае пачэснае месца сярод брацкіх рэспублік. Яна з'яўляецца перадавым фарпостам на граніцы з капіталістычным Захадам. Некалі бяспраўная і адсталая калонія царызма, Беларусь толькі пры дапамозе вялікага рускага рабочага класа, пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі і асабіста таварыша Сталіна, атрымала ўпершыню сваю дзяржаўнасць, вызвалілася ад белапольскіх паноў-інтэрвентаў — вечных ворагаў беларускага народа. Толькі ў цесным Саюзе Совецкіх Социялістычных Рэспублік БССР магла развівацца і стаць квітнеючай орденаноснай рэспублікай. Большэвіцкай партыі, вялікаму Сталіну беларускі народ абавязаны сваім шчаслівым радасным жыццём, сваёй магутнай квітнеючай прамысловасцю, буйнай социялістычнай сельскай гаспадаркай, нябачаным росквітам культуры, нацыянальнай па форме, социялістычнай па зместу.

І беларускі народ увесь, як адзін, сёння, — у дзень слаўнага 15-годдзя СССР, у дзень таржаства ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, заяўляе, што ён сумесна з Чырвонай Арміяй, са слаўнымі пагранічнікамі заўсёды напагатове, што ён памятае ўказанні праадыра народаў таварыша Сталіна аб капіталістычным акружэнні, што ён свята выконвае завет аб павышэнні большэвіцкай пільнасці.

Беларускі народ і надалей будзе выкрываць і бязлітасна знішчаць усіх здрадзнікаў, усіх ворагаў нашай радзімы, шпіёнаў, шкоднікаў і дыверсантаў японагерманскага і польскага фашызма.

БССР была, ёсць і будзе неад'емнай і неразрыўнай часткай Совецкага Саюза, баявым фарпостам СССР на яго заходніх граніцах!

ДЭКЛАРАЦЫЯ АБ УТВАРЭННІ САЮЗА СОВЕЦКІХ СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК

З часу ўтварэння совецкіх рэспублік дзяржавы света раскалоліся на два лагеры: лагер капіталізма і лагер социялізма.

Там, у лагеры капіталізма, — нацыянальная варожасць і няроўнасць, каланіяльнае рабства і шавінізм, нацыянальнае прыгнечанне і пагромы, імперыялістычныя зверствы і войны.

Тут, у лагеры социялізма, — узаемнае давер'е і мір, нацыянальная свабода і роўнасць, мірнае сужыццё і брацкае супрацоўніцтва народаў.

Спробы капіталістычнага свету на працягу дзесяткаў год вырашыць пытанне аб нацыянальнасці шляхам сумяшчэння свабоднага развіцця народаў з сістэмай эксплаатацыі чалавека чалавекам аказаліся бясплоднымі. Наадварот, клубок нацыянальных супярэчнасцей усё больш заблытваецца, пагражаючы самому існаванню капіталізма. Буржуазія аказалася бяссільнай наладзіць супрацоўніцтва народаў.

Толькі ў лагеры Совецаў, толькі ва ўмовах дыктатуры пролетарыята, згуртаваўшай вакол сябе большасць насельніцтва, аказалася магчымым знішчыць у корані нацыянальны гнёт, стварыць абстаноўку ўзаемнага давер'я і закласці асновы брацкага супрацоўніцтва народаў.

Толькі дзякуючы гэтым абставінам удалося совецкім рэспублікам адбіць напад імперыялістаў усяго свету, унутраных і знешніх; толькі дзякуючы гэтым абставінам удалося ім паспяхова ліквідаваць грамадзянскую вайну, забяспечыць сваё існаванне і прыступіць да мірнага гаспадарчага будаўніцтва.

Але годы вайны не прайшлі бясследна. Спустошаныя палі, спыніўшыяся заводы, разбураныя вытворчыя сілы і вычарпаныя гаспадарчыя рэсурсы, якія асталіся ў спадчыну ад вайны, робяць недастатковымі асобныя намаганні асобных рэспублік па гаспадарчаму будаўніцтву. Аднаўленне народнай гаспадаркі аказалася немагчымым пры раздзельным існаванні рэспублік.

З другога боку, няўстойлівасць міжнароднага становішча і небяспека новых нападаў робяць немінучым стварэнне адзінага фронта совецкіх рэспублік перад тварам капіталістычнага акружэння.

Нарэшце, сама будова совецкай улады, інтэрнацыянальнай па сваёй класавай прыродзе, штурхае працоўныя масы совецкіх рэспублік на шлях аб'яднання ў адну социялістычную сям'ю.

Усе гэтыя акалічнасці ўладарна патрабуюць аб'яднання совецкіх рэспублік у адну саюзную дзяржаву, здольную забяспечыць і знешнюю безапаснасць, і ўнутраны гаспадарчы поспех, і свабоду нацыянальнага развіцця народаў.

Воля народаў совецкіх рэспублік, сабраўшыхся нядаўна на з'езды сваіх Совецаў і аднадушна прыняўшых рашэнні аб утварэнні «Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік», служыць надзейнай парукай у тым, што Саюз гэты з'яўляецца добраахвотным аб'яднаннем роўнапраўных народаў, што за кожнай рэспублікай забяспечана права свабоднага выхаду з Саюза, што доступ у Саюз адкрыт усім социялістычным совецкім рэспублікам як існуючым, так і маючым узнікнуць у будучым, што новая саюзная дзяржава з'явіцца дастойным увянчаннем закладзеных яшчэ ў кастрычніку 1917 года асноў мірнага сужыцця і брацкага супрацоўніцтва народаў, што яно паслужыць верным аплотам супроць сусветнага капіталізма і новым рашучым крокам па шляху аб'яднання працоўных усіх краін у сусветную Социялістычную Совецкую Рэспубліку.

Заяўляючы аб усім гэтым перад усім светам і ўрачыста агалашаючы непахіснасць асноў совецкай улады, знайшоўшых сваё адлюстраванне ў канстытуцыях упаўнаважыўшых нас социялістычных совецкіх рэспублік, мы, дэлегаты гэтых рэспублік, на падставе даных нам поўнамоцтваў, пастанаўляем падпісаць дагавор аб утварэнні «Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік».

УЗОР БОЛЬШЭВІЦКАГА КІРАЎНІЦТВА СТАХАНАЎСКІМ РУХАМ

Публікуемая сёння*) пастанова Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) з поклікам «Зварота стахановаў фабрык і заводаў Масквы і Маскоўскай вобласці» будзе мець выключнае значэнне для далейшага росту стахановскага руху, для яго пераможнага развіцця. Цэнтральны Камітэт дае ўзор канкрэтнага сталінскага кіраўніцтва стахановскім рухам, папярэджвае ад памылак і ўказвае на правільны шлях далейшага ўздыму гэтага выдатнага руху.

Узнікненне стахановскага руху таварыш Сталін ацаніў як выражэнне новага, вышэйшага этапа социялістычнага спаборніцтва, як рух рабочых і работніц, які запоўніць адну з слаўных старонак у гісторыі социялістычнага будаўніцтва. Партыя ўбачыла ў стахановскім руху ўзоры той высокай прадукцыйнасці працы, якую можа даць толькі социялізм і не можа даць капіталізм. У стахановскім руху сталінскі Цэнтральны Камітэт разглядзеў пачаткі такога культурна-тэхнічнага ўздыму рабочага класа, які падрывае асновы прапілегласці паміж працай разумовай і фізічнай і падрыхтоўвае ўмовы для пераходу ад социялізма да комунізма. Партыя, Цэнтральны Камітэт, таварыш Сталін узрасцілі стахановскі рух, акружылі стахановаў любоўю, зрабілі на ўвесь свет вядомымі іх імёны і паказалі ўсяму народу вялікае, сапраўды гістарычнае значэнне стахановскага руху.

Як толькі гэты рух зарадзіўся ў глыбіні рабочага класа, як толькі ён, здмаўшы ўсе перашкоды, прарваўся на верх і абвясціў аб сабе зыдатнымі вытворчымі рэкордамі, Цэнтральны Камітэт партыі патрабаваў ад партыйных, гаспадарчых і профсаюзных кіраўнікоў, каб яны ўзначалілі стахановскі рух і зрабілі яго масавым, бо сіла стахановскага руху ў яго масавасці. Таварыш Сталін гаварыў яшчэ на першай усесаюзнай нарадзе стахановаў у Крэмлі: «Задача заключаецца ў тым, каб дапамагчы стахановам разгарнуць далей стахановскі рух і распаўсюдзіць яго ўшыр і ўглыб на ўсе вобласці і раёны СССР».

Трацкістска - бухарынскія шпіёны і шкоднікі падрывалі стахановскі рух, перашкаджалі стахановам. Калі найміты фашысцкіх разведак былі выкрыты, сімтым пачала прапаведвацца гнілая тэорыя, упарта падтрымліваемая самімі шкоднікамі, аб тым, што стахановскі рух сам перакрые вынікі шкодніцтва. Цэнтральны Камітэт партыі, які аберагае стахановскі рух ад усякіх на яго замахаў, разграміў гэту гнілую тэорыю. Таварыш Сталін на лютаўска-сакавіцкім пленуме ЦК ВКП(б) заявіў, што барацьба са шкодніцтвам, барацьба за ліквідацыю шкодніцтва, абуздзанне шкодніцтва з'яўляецца ўмовай, неабходнай для таго, каб стахановскі рух разгарнуўся ва ўсю шырыню. І сапраўды, тое ажыўленне ў стахановскім руху, якое мы наглядаем цяпер, тая хваля новых рэкордаў, якая зараз пракацілася па ўсёй краіне, ёсць, несумненна, адзін з рэзультатаў паспяховай барацьбы партыі са шкодніцтвам.

На лютаўска-сакавіцкім пленуме ЦК ВКП(б) таварыш Сталін зноў і зноў падкрэсліў неабходнасць дапамогі стахановам і кіраўніцтва імі. Гэта задача яшчэ далёка не поўнасцю вырашана. Велізарная армія ўдарнікаў выхавалася на нашых заводах, яна гатова далучыцца да стахановскага руху, але чакае дапамогі і кіраўніцтва з боку інжынераў, тэхнікаў, гаспадарчых, партыйных, профсаюзных работнікаў. Стахановскія метады адзіночак яшчэ не сталі метадамі работы палых пахаў, фабрык і заводаў.

Многія гаспадарчыя кіраўнікі пайшлі па найбольш лёгкаму шляху, па шляху падрыхтоўкі асобных стахановскіх рэкордаў, забываючы аб кіраўніцтве ўсёй масай стахановаў і ўдарнікаў. Стахановскія рэкорды патрэбны і карысны, бо яны адкрываюць новыя магчымасці ў выкарыстанні тэхнікі. **Але стахановскі рух зусім не складаецца з адных рэкордсменаў**, а аб гэтым некаторыя таварышы забываюць. Захапленне асобнымі рэкордамі знайшло сваё выражэнне і ў палрыхтоўваўшымся па ініцыятыве МК ВКП(б) і снежаньскай нарады стахановаў Масквы і Маскоўскай вобласці «Сталінскім месяцы стахановскіх рэкордаў». Ужо сама назва месячніка абмяжоўвала яго размах, бо гутарка ў ім ішла **толькі аб рэкордах стала быць, аб рэкардсменах, а не аб усіх стахановцах.** Гэтага не ўлічыў Маскоўскі камітэт, гэтага не ўлічыў і наш друк.

Цэнтральны Камітэт ВКП(б) указаў у сваёй пастанове:

«Нельга лічыць правільным найменаванне мяркуемага стахановскага месячніка «Сталінскім месяцам стахановскіх рэкордаў», бо ўсякі тыднёвік або месячнік стахановскага руху павінен датычыць усіх стахановаў, а не толькі рэкардсменаў, работа якіх ахапляе толькі самую нязначную частку стахановскага руху, пры гэтым расшырэнне радоў стахановаў у перыяд тыднёвіка або месячніка павінна лічыцца адной з важнейшых задач, што, на жаль, упушчана ў даным выпадку Маскоўскім камітэтам ВКП(б) і вядомым зваротам стахановаў Масквы і Маскоўскай вобласці».

На маскоўскім станказаводзе імя Орджанікідзе, дзе працуе вядомы стахановец Гудаў, які выканаў за змену 90 норм, стахановаў—некалькі сот, а рэкардсменаў 10—12. Калі правядзіць месячнік рэкордаў, то выходзіць, што ў ім змаглі-б прымаць удзел гэтыя некалькі рэкардсменаў, а ўся маса стахановаў — паслядоўцаў Гудаева, якія даюць паўтары-дзве-тры нормы, але не могуць устанаўліваць новых рэкордаў, не абганяюць Гудаева, — выключаецца з удзелу ў месячніку.

У Данбасе больш 25 тысяч шахцёраў даюць па дзве нормы выпрацоўкі і заслужана нясуць ганаровае званне стахановаў. У масе сваёй гэта не рэкардсмены.— гэта паслядоўцы Стаханава, Дзюканаза, Моластава, іх вучні, якія даюць высокую, але не рэкордную прадукцыйнасць. Выходзіць, што большасць з іх не змагла-б быць удзельнікамі месяца рэкордаў.

На Каломенскім заводзе імя Куйбышэва больш двух тысяч стахановаў сістэматычна даюць па дзве нормы. На гэтым заводзе з вялікім поспехам развіваецца рух двухсотнікаў. Рэкардсменаў-жа на заводзе некалькі чалавек. Пасля вядомага рэкорда Гудаза дырэктар Каломенскага завода сабраў рэкардсменаў і перад найбольш выдаючымися з іх паставіў пытанне: а ці не могуць даць яны яшчэ большыя рэкорды? У той-жа час усёй масе рабочых, — а іх больш 20 тысяч, — не расказалі, якімі метадамі Гудаў і іншыя рэкардсмены дабіліся бліскучых поспехаў. Вось да чаго прыводзіць пагоня толькі за асобнымі рэкордамі.

Цэнтральны Камітэт ВКП(б) у сваёй пастанове напомніў, што адной з важнейшых задач тыднёвіка ці месячніка стахановскага руху пазінна лічыцца **расшырэнне радоў стахановаў.** Само сабой зразумела, такі месячнік прынясе поспех, калі яго як належыць падрыхтаваць. У даным выпадку час для стахановскага месячніка, студзень, быў выбран няўдала, і вельмі кароткі тэрмін, які астаўся да першага студзеня, не дае магчымасці як належыць да яго падрыхтавацца. Нельга непрадумана, згарача, без падрыхтоўкі пачынаць вялікую справу, у якой пазінны прымаць удзел сотні тысяч людзей. Арганізаванасць, дысцыплінаванасць, падрыхтоўка наступлення і выбар для гэтага ўдалага моманту — у гэтым адна з асаблівасцей сталінскага стылю кіраўніцтва.

Рашэнне Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) саслужыць велізарную неацанімую службу для стахановскага руху. Цэнтральны Камітэт арыентуе ўсю партыю, усесь рабочы клас на далейшае расшырэнне радоў стахановаў, на клопаты не толькі аб рэкардсменах, а аб усіх стахановаў. Няма сумнення, што стахановскі рух за гэтага моцна выйграе, упягне ў свае рады новыя атрады рабочых, якія бачаць у стахановскім руху шлях да яшчэ большага росквіту нашай радзімы.

«ПРАВДА»

*) Глядзі «Звязду» ад 29 снежня г. г.

ЯКУБ КОЛАС.

ПАД СЦЯГАМ ЛЕНІНА—СТАЛІНА

Нас дружба народаў навекі злучыла,
У нашым яднанні мы—грозная сіла—
Няма для яе перашкод.
Пад ленінска-сталінскім сцягам і словам,
Мы сонечным шляхам, чаруючым, новым,
Ізем нясупынна ўпярод.
Хоць шлях наш і трудны, хоць ворагаў многа, —
Мы скінем з дарогі асколкі гнілога.—
Ці-ж ім запыніць наш паход?
Гранітную сілу выкоўвае Сталін,
Дзень пройдзе — і болей іскрыстых прагалін,
Год пройдзе — і вышай узлёт.
Нас дружба народаў навекі злучыла.
У нашым яднанні мы — грозная сіла
Няма для яе перашкод!
Жыві-ж, ты, з'яднанасць і дзень златакудры!
Жыві, правадыр наш бясстрашны і мудры!
Жыві, наш совецкі народ!

27/XII 1937 г.

СУЗОР'Е АДЗІНАЦЦАЦІ

Царскую Расію Уладзімір Ільіч Ленін назваў «турмой народаў». У гэтых двух словах з вычэрпваючай паўнатой і яснасцю адлюстравана становішча шматлікіх нацыянальнасцей былой Расійскай імперыі.

Гісторыя прыгнечаных народнасцей былой царскай Расіі поўна жудасных старонак, пісаных кроўю. Плач і стогны раздаваліся над абшырнай краінай. У гэтай турме шматлікія народы задыхаліся ў дзікасці і цемры, вымралі ад эпідэмій, гінулі пад цяжкім ботам царскага самадзяржаўя.

Паглядзіце на карту вялікага, неабсяжнага Совецкага Саюза... Ад Чорнага мора да берагоў Ціхага акіяна, ад Паўночнага полюса да сонечнай Арменіі раскінулася наша вялікая магутная радзіма.

Ажыццяўляючы ленінска-сталінскую нацыянальную палітыку, совецкая ўлада разбурыла таіўшыяся ў нашым 170-мільённым народзе невычарпальныя крыніцы рэволюцыйнай энергіі, творчасці і талентаў. Вольная праца адразіла чалавечую годнасць сярод самых адсталых, прыгнечаных народаў. З велізарнейшай энергіяй і самаадданасцю ўсе народы нашай пералоўнай радзімы будуюць новае, радаснае жыццё. Адсюль — шулы гераізма, стаўшыя штодзённым з'явішчам у нашай краіне.

Пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі рэспублікі краіны Совецкаў хутка разгарнулі свае традыцыйныя сілы, пышным цветам расквіла народная гаспадарка, бурнай крыніцай забіла народная творчасць.

Геніем вялікага Сталіна пераможна ажыццёўлена карэнная социялістычная пераробка краіны: на былых бязлюдных, глухіх і адсталых украінах вырастаюць новыя социялістычныя гарады, узвышаюцца велізарнейшыя карпусы заводаў, фабрык і электрастанцый, кіпіць радасная праца на калгасных і саўгасных палях, радасным золотулем раздаецца гул матораў, трактараў і камбайнаў.

Магутны, багаты, неазмерна вялікі Совецкі Саюз!

Непрыступнай социялістычнай цвярдыняй узвышаецца ён на адной шостай частцы земнага шара.

Невычэрпны яго багацці. Неазмерна вялікі яго магчымасці. СССР — сузор'е адзінаццаці рэспублік, адзінаццаці каштоўнейшых жамчужын, аб'яднаных у адну чароўную, бліскучую, ззяючую на ўвесь сзет, чырвоную зорку.

Першае месца ў гэтым пералоўным сузор'і займае **РСФСР** — цытадэль социялістычнай рэволюцыі. Першая сярод роўных. Старшая з адзінаццаці. 17 аўтаномных рэспублік і 6 аўтаномных абласцей яднае яна. Ад арктычных лёдавых пустынь, ад суровай тундры і глухой тайгі да сонечных субтропікаў раскінуліся яе абшары. 70 процантаў усёй прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі краіны дае РСФСР.

На далёкіх астравах Арктыкі, у лясах Камчаткі, на таежных прасторах Сібіры, на Далёкім Усходзе, адроджаным да жыцця воляю большэвікоў, у залатаносным Калыме, на Сахаліне—былой царскай катарзе, — усюды кіпіць бурнае, творчае, радаснае жыццё.

Пышным цветам расквіла і ўмацавалася **Совецкая Украіна.** Яна стала магутнай індустрыяльна-калгаснай рэспублікай. Пшаніца, цукровыя буракі, зугаль, жалезная руда і іншыя выкапні, хімія, машынабудаўніцтва, металургія і электраэнергія — многім багата чароўная Украіна. Чэрць усесаюзнага збору хлябоў, дзве трэці цукру, звыш паловы ўсяго зугалю, чыгуну і солі дае яна Саюзу ССР. Краіна прыгожых тапалёў і вішнёвых садоў, белых мазанак, апетых паэтамі — яна стала краінай металургіі, машынабудаўніцтва, краінай Днепрагэса і ХТЗ, радзімай вялікага стаханаўскага руху. Цудоўных, выдатных людзей — сапраўдных герояў социялістычнай працы — сырасціла, выхавала УССР.

Хто не ведае слаўнае імя Алексея Стаханава, слаўутага сталязара Макара Мазая, выдатнай пяцідзённіцы Марыі Дземчэнка, слаўнага машыніста Петра Крываноса, акадэміка-даследчыка Лысенка, пісьменніка-драматурга Карнейчука і інш. Непаэтаваным, чароўным горадам стала яе сталіца — старадаўні Кіеў, «маці рускіх гарадоў»

Дзякуючы штодзённым клопатам вялікага Сталіна, з дапамогаю рускага рабочага класа расцвіла ў сузор'і 11 рэспублік і наша **Совецкая Беларусь.** Заводы і фабрыкі, калгасы і саўгасы, інстытуты й школы, тэатры і кіно пакрылі зямлю Беларусі — гэтай у мінулым закінутай, прыгнечанай, адсталай калоніі царскай Расіі.

У 22 разы вырасла супроць даваеннага ўзроўню прамысловасць Беларусі.

Высокія ўраджаі заваявалі калгаснікі на раней бедных, зморaных глебах. 700 тысяч гектараў веказечных балот ператварылі яны ў квітнеючыя лугі і раллю.

Краіна, дзе раней адзе трэці насельніцтва грузлі ў цемры і невуцтве, стала рэспубліканскай супольнай пісьменнасці.

Лесам, паперай, запалкамі, цэментам, шклом, гатовай вопраткай і машынамі снабжае БССР брацкія рэспублікі.

Нязломным фарпостам стаіць Беларусь на рубяжы з капіталістычным Захадам. На моцным замку яе граніцы. Пільна дзень і ноч ахоўваюць межы мужныя і смелыя вартавыя — пагранічнікі.

Грузінская, Азербайджанская, Армянская ССР. Сонечныя, квітнеючыя совецкія рэспублікі. У цеснай дружбе народаў вырасла іх індустрыя, высока развілася сельская гаспадарка. Нязлічана багаты іх землі, пладаносны іх чаруючыя сады; пышна расцвілі людскія таленты. Суцэльнымі садамі і вінаградніками, цудоўнымі субтропічнымі плантацыямі апаясаны гарады і вёскі Закаўказзя.

Нафта, марганец, медзь, араматны табак, егіпецкая бавоўна, пахучы чай, лепшыя віны, шоўк, сочныя фрукты, субтропічныя цытрусавыя культуры — апельсіны, лімоны, мандарыны. Такі, далёка няпоўны, пералік дараў гэтых трох прыгожых жамчужын Совецкай краіны.

Гэтыя, раней адсталыя, аграрныя краіны сталі магутнымі індустрыяльнымі рэспублікамі. Пры Совецкай уладзе ў Грузіі пабудавана каля 200 новых прамысловых прадпрыемстваў і рад раённых гідраэлектрычных станцый. У параўнанні з даваенным часам прадукцыя прамысловасці ўзрасла ў 19 раз. Здабыча нафты ў Азербайджане ўзрасла больш чым у тры разы. Азербайджан стаў галоўнай нафтавай базай Совецкага Саюза. Бурныя, імклівыя, капрызныя горныя рэкі Грузіі і Арменіі пастаўлены на службу социялізма.

Нявекі зніклі міжнацыянальная розань і варожасць. Незлічонымі багаццямі бавоўны, шоўку, шэрсці, каракуля, рыбы, сочных пладоў улалаюць рэспублікі Сярэдняй Азіі—**Узбекская, Туркменская, Таджыкская ССР.** Хутка расце социялістычная прамысловасць у гэтых, раней прыгнечаных, калоніях царскай Расіі, дзе ўсясільнымі царкамі панавалі нікалаеўскія сатрапы.

Цераз непраходныя горы, цераз непрыступныя зярпышні пракладзены шасейныя дарогі і лініі чыгунак. Абводнены дзесяткі тысяч гектараў раней бясплоднай зямлі; на іх зараз збіраюць багатэйшыя ўраджаі каштоўнай, высокаякаснай егіпецкай бавоўны.

Дэкада узбекскага мастацтва ў Маскве паказала ўсяму свету велічэзны рост і пералоўны росквіт талентаў вызваленага узбекскага народа.

Ператварыліся абшырныя стэпы **Казахстана,** дзе вякамі вандравалі жывёлаводы, Казахская ССР — гэта рэспубліка, пакрытая сеткаю школ, тэхнікумаў, рэспубліка, стварыўшая магутную жывёлагадоўлю, социялістычную сельскую гаспадарку і зыватныя індустрыяльныя ачагі. Турксіб, Рыдэр, вугальныя шахты Караганды, гігант каляровай металургіі Прыбалхашбуд, нафтавыя вышкі Эмбы, — уся краіна пястуе гэтыя дзецішчы двух пяцігодак.

Па ініцыятыве таварыша Сталіна большэвікі Казахстана ствараюць новую магутную базу каляровай металургіі. 75 процантаў агульнасаюзных запасаў свінца, 65 процантаў запасаў меднi, 50 процантаў цынка знаходзіцца ў Казахстане — маладой саюзнай рэспубліцы, створанай Сталінскай Канстытуцыяй.

Пышна квітнее **Совецкая Кіргізія** — рэспубліка цукру, бавоўны, кенафу, сытых атар і багатых, пладаносных садоў.

***

Паглядзіце на карту вялікага Совецкага Саюза — усюды пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі бачым росквіт 170-мільённай дружнай брацкай сям'і свабодных народаў.

Як пяе 90-гадовы пясняр Казахстана Джамбул:

«У Сталінскім нашым саду расцвілі
Адзінаццаць гордых жамчужын зямлі».



ШЧАСЦЕ НАМ ДАЛА СОВЕЦКАЯ УЛАДА

Мне каля 60 год, але сапраўдным чалавекам я адчуў сябе толькі пры совецкай уладзе. Цяжкае, беспрасветнае было жыццё працоўнага узбека пры царызме. Бацька мой усё жыццё быў батраком у кулака. З дзяцінства і я пачаў працаваць у бая. Усё спякотнае лета, кожны дзень ад самага рання да позняй ночы мы, сагнуўшы плечы, працавалі ўсёй сям'ёй.

Кулак Апіджанбай у полі не працаваў. Але калі наступаў час збору бавоўны, ён выходзіў у поле. Ураджай раскладаўся на тры роўныя кучкі. Дзве бацька адносіў на сваіх плячах у свіран гаспадара, а адну—да нас у кібітку. Бавоўну прадавалі па ніскай цане спекулянтам. З выручаных грошай плацілі даўгі і розныя палаткі: падушны, царскаму чыноўніку, водны, на апрацоўку зямлі. мулу, святочныя і інш. У рэзультаце на зіму аставаліся голымі і галоднымі.

Шчаслівае жыццё мне дала совецкая ўлада, партыя Леніна—Сталіна. Я маю свой дом, карову, двух бараноў і шмат іншай маемасці. Дзеці маё добра апрануты, ходзяць у школу. Я таксама навучыўся грамаце ў калгасе, чытаю газеты. Ёсць у мяне патэфон.

Калгас забяспечыў мне заможнае, культурнае жыццё. У 1935 годзе маё звяно дало дзяржаве 45 цэнтнераў бавоўны з гектара. Я быў на прыёме ў Крэмлі ў нашага бацькі і настаўніка таварыша Сталіна. Мяне ўзнагародзілі ордэнам Леніна.

Буржуазныя нацыяналісты хацелі павярнуць гісторыю назад, аднавіць уладу капіталістаў, баеў, мул, наізсь ярмо фашызма на свабодны узбекскі народ.

Яны пралічыліся. Гэтаму не бывань ніколі. Рабоў-узбекаў ужо няма і не будзе, ёсць свабодны узбекскі народ, які разам з усімі працоўнымі Совецкага Саюза, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і вялікага правадыра таварыша Сталіна будуе сваю социялістычную дзяржаву.

САПАР Алі Юльчыеў,
звеньевы калгаса імя Калініна, Ленінскага раёна, Узбекскай ССР.

УСЕ НАРОДЫ ЖЫВУЦЬ ДРУЖНА

Я мардвін. Належу да нацыі, якая ў мінулым была адной з самых адсталых у царскай Расіі. Мае бацькі, дзяды і прадзеды не бачылі свету. Яны не мелі нават душазога надзелу. Жылі бедна, маючы патрэбу ў хлебе. Над мардвой здзекаваліся, на яе націскоўвалі іншыя нацыі.

Але вось прышла совецкая ўлада, і мардва стала роўнаправнай з усімі нацыянальнасцямі, насяляючымі вялікі Совецкі Саюз.

Партыі Леніна—Сталіна мы, нацыянальныя меншасці, абавязаны сваім разняволеннем, сваім шчасцем. Успамінаючы аб мінулым свайго народа, я сёння яшчэ раз дзякую тазарышу Сталіну, запэўняю партыю, урад, што гатоў, калі патрэбна будзе, аддаць сваё жыццё за нашу чароўную радзіму.

ОСКІН АЛЯКСАНДР ІВАНАВІЧ,
дэпутат Вярхоўнага Совета, знатны камбайнер.

АДРОДЖАНЫ ТУРКМЕНСКІ НАРОД

Дзапцаць год таму назад я быў батраком. Пасвіў вярблюдаў, належаўшых баям Гельды і Раджап Каша, толькі марыў мець свайго ўласнага вярблюда.

Не мінаваць-бы мне лёсу каратаць усё жыццё батраком, калі-б не рэволюцыя, калі-б не вялікі саюз народаў вашай неабсяжнай краіны Совецкаў, які пабудаваў, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі большэвікоў, социялістычнае грамадства. Дзесяць год таму назад я быў ужо старшынёй аулсовета Карлы-Чарлы, я быў ужо комуністам і сам будаваў жыццё. Прайшло яшчэ дзесяць год, і пяпер я—дэпутат Вярхоўнага Совета СССР, прымаю ўдзел у кіраванні вялікай дзяржавай.

Такое маё жыццё, калі лічыць дзесяткі год. Толькі тады, калі туркменскі народ, у саюзе з народамі ўсяго Совецкага Саюза, пайшоў у бой за радасць, за шчасце, за социялізм — толькі тады жыццё працоўных Туркменіі, маё жыццё забіла крыніцай.

На нашы палі прышоў багаты ўраджай бавоўны, нашы свірны напоўніліся хлебам, нашы калгаснікі сядлаюць не толькі вярблюдаў, але і сталёзых коней, прыгожых ахалтэкінцаў. На такіх калгасных конях два гады таму назад трыццаць джыгітаў Туркменіі, перамогшы цяжкі шлях у чатыры тысячы дзвесце кіламетраў, прывезлі ў Маскву рапарт аб поспехах і шчасці туркменскага народа. Я быў у гэтым прабегу парторгам.

У стэпах Казахстана, у Паволжы, у Чузашыі — усюды нас сустракалі, як братоў. Радасна было бачыць камбайны, мора пшаніцы палёў Паволжа, Каломенскі паравозабудаўнічы завод, Люберэцкі завод сельскагаспадарчых машын, параходы, што плылі па Волзе, родную Маскву, родны Крэмль. Мы ведалі, што такія камбайны збіраюць пшаніцу ў Таджэнскім і Серахскім раёнах Туркменіі, што пеплаходы, пабудаваныя на Каломенскім заводзе, вязуць нафту і бавоўну па Волзе, рассякаючай Кара-Кумы паміж Мары Чарджоу, што параходы вязуць у нашу Туркменію прамысловыя тавары. Мы ведалі: усё, што бачылі, належыць і туркменскаму народу. Мы бачылі плады дружбы народаў СССР на палях і заводах Туркменістана.

Дзесяць год таму назад у аўле Карлы-Чарлы не існавала калгасаў. Тады ва ўсёй Туркменіі было ўсяго некалькі дзесяткаў таварыстваў сумеснай апрацоўкі зямлі, амаль не было прамысловасці, затое шмат было непісьменных дайхан.

А цяпер? У 1700 сельскагаспадарчых арцелях Туркменістана знаходзіцца 95,4 проц. усіх дайхан. Збор бавоўны павялічыўся ў 4 разы. З'явіліся ў Туркменіі шоўкаматальныя, ватная, тэкстыльная, шэйныя, абутковая і іншыя фабрыкі, механізаваны шкляны, нафтаперагонны заводы. З кожным годам робіцца ўсё менш і менш непісьменных. У чатырох перадавых раёнах зараз уведена абавязковае сямігадовае навучанне.

Акрыленая дружбай народаў, зырасла наша рэспубліка. Пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі туркменскі народ ідзе, разам з усімі народамі Совецкага Саюза, да новых перамог па шляху, паказанаму вялікім і мудрым Сталіным.

ГАБЫШ МАМЫШ,
ордэнаносец, дэпутат Совета Нацыянальнасцей, дырэктар Ашхабадскага конезавода.

СССР—МАГУТНАЯ ШМАТНАЦЫЯНАЛЬНАЯ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ ДЗЯРЖАВА

15 год назад, 30 снежня 1922 года, Першы з'езд Совецкаў СССР па дакладу таварыша Сталіна зацвердзіў прыняты з'ездамі Совецкаў РСФСР, УССР, БССР і ЗСФСР дагавор аб аб'яднанні гэтых чатырох рэспублік у саюзную дзяржаву. У гістарычнай «Дэкларацыі аб стварэнні Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік», прынятай з'ездам, гаварылася:

«Воля народаў совецкіх рэспублік, сабраўшыхся нядаўна на з'езды сваіх совецкаў і аднадушна прыняўшых рашэнні аб стварэнні «Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік», служыць надзейнай парукай у тым, што Саюз гэты з'яўляецца добраахвотным аб'яднаннем роўнаправных народаў, што за кожнай рэспублікай забяспечана праза свабоднага выхаду з Саюза, што доступ у Саюз адкрыт усім Социялістычным Совецкім Рэспублікам як існуючым, так і маючым узнікнуць у будучым, што новая саюзная дзяржава з'яўляцца дастойным увянчаннем закладзеных яшчэ ў кастрычніку 1917 г. асноў мірнага сужыцця і брацкага супрацоўніцтва народаў, што яна паслужыць верным аплотам супроць сусветнага капіталізма і новым рашучым крокам па шляху аб'яднання працоўных усіх краін у сусветную Социялістычную Совецкую Рэспубліку».

Ленін і Сталін натхнялі і кіравалі ўсёй велізарнай работай па стварэнню шматнацыянальнай совецкай дзяржавы.

Яшчэ задоўга да Вялікай социялістычнай рэволюцыі Ленін і Сталін распрацавалі і абгрунтавалі праграму партыі большэвікоў у нацыянальным пытанні. Цёрда апіраючыся на прынцыпы ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, паслядоўна праводзячы ў жыццё гэту палітыку, совецкая ўлада з першых дзён свайго існавання ўзяла курс на арганізацыю «сумеснага сужыцця пэлага раду нацыянальнасцей і плямён у рамках адзінай пролетарскай дзяржавы на пачатках узаемнага давер'я, на пачатках добраахвотнай, брацкай згоды». (**Сталін.** «Палітыка совецкай улады па нацыянальнаму пытанню ў Расіі»).

Царская Расія была сапраўднай «турмой народаў». Нацыянальная палітыка царызма была накіравана да распальвання нацыянальнай розні, да зверскага падаўлення і нястрымнай эксплаатацыі народнасцей. Царызм памерана культываваў гаспадарчую і культурную адсталасць нацыянальных украін. Працоўныя нярускіх нацыянальнасцей стагналі пад страшным падвойным гнётам рускіх капіталістаў і памешчыкаў і «сваёй» нацыянальнай буржуазіі, эміраў, ханаў, бекаў, духавенства.

Вялікая Кастрычніцкая социялістычная рэволюцыя разбіла ланцугі нацыянальнага прыгнечання і няроўнаправя. «Устанаўленне совецкага ладу ў Расіі і абвяшчэнне права нацый на дзяржаўнае аддзяленне перавярнулі адносіны паміж працоўнымі масамі нацыянальнасцей Расіі, падарвалі старую нацыянальную варожасць, пазбавілі глебы нацыянальны гнёт і заваявалі рускім рабочым давер'е іх іншанацыянальных братоў не толькі ў Расіі, але і ў Еўропе і ў Азіі, давялі гэтае давер'е да энтузіязма, да гатоўнасці змагацца за агульную справу». (**Сталін.** «Аб чарговых задачах партыі ў нацыянальным пытанні»).

Брацкі саюз народаў СССР мацнеў і развіваўся ў сумеснай барацьбе працоўных усіх нацыянальнасцей, пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна, за перамогу Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі, на франтах грамадзянскай вайны супроць аб'яднаных сіл айчыннай і міжнароднай буржуазіі, у гераічнай барацьбе за адналенне разбуранай двума войнамі народнай гаспадаркі, за ажыццяўленне сталінскіх пяцігодак. «У першы перыяд рэволюцыі, — як адзначыў XII з'езд РКП(б), — калі працоўныя масы нацыянальнасцей упершыню адчулі сябе самастойнымі нацыянальнымі велічынямі, між тым як пагроза замежнай інтэрвенцыі не ўяўляла яшчэ рэальнай небяспекі, — супрацоўніцтва народаў не мела яшчэ зусім паўнай, строга ўстанавіўшайся формы». Але ўжо к канцу 1918 года абстаноўка патрабавала больш цеснага супрацоўніцтва совецкіх народаў, бо ім прышлося весці сумесную барацьбу супроць велізарных узброеных полчышч белагвардзейцаў і інтэрвентаў, якіх стары свет ярасна абрушыў на малалыя совецкія рэспублікі.

Народы Беларусі, Украіны, Каўказа імкнуліся да больш цеснага супрацоўніцтва з вялікім рускім народам, з РСФСР — гэтай цытадэллю социялістычнай рэволюцыі, — бо ў такім супрацоўніцтве заключаўся залог перамогі над узброенымі сіламі контррэволюцыі. Натуральна, што ў гэты перыяд, калі на першым плане стаялі задачы ўзброенай барацьбы з белагвардзейцамі і інтэрвентамі, супрацоўніцтва нацыянальных совецкіх рэспублік прыняло форму ваеннага саюза. Ваенны саюз совецкіх рэспублік прывёў да разгрому ўзброеных сіл буржуазіі і памешчыкаў, даў рабочым і сялянам перамогу на ўсіх фронтах грамадзянскай вайны.

Па меры ліквідацыі ваенных фронтаў перад працоўнымі ўсіх нацыянальнасцей на першы план высоўваліся задачы гаспадарчага будаўніцтва, ліквідацыі цяжкай гаспадарчай разрухі, як спадчыны двух зойн, — імперыялістычнай і грамадзянскай. Абстаноўка патрабавала, каб ваенны саюз совецкіх рэспублік быў дапоўнен саюзам гаспадарчым.

З трыбуны X Усерасійскага, а затым I Усесаюзнага з'езда Совецаў таварыш Сталін у сваіх гістарычных дакладах з геніяльнай празорлівасцю абгрунтаваў неабходнасць пераходу ад старых дагаворных адносін паміж рэспублікамі да стварэння адзінай саюзнай совецкай дзяржавы.

Немінучасць аб'яднання совецкіх рэспублік у адну саюзную дзяржаву, як указваў таварыш Сталін, дыктавалася, па-першае, тым, што трэба было з'яднаць сілы совецкіх рэспублік для ліквідацыі гаспадарчай разрухі, скарыстаць у інтарэсах эканамічнага ўзыму краіны гістарычна склаўшаеся гаспадарчае пазяленне працы паміж рознымі раёнамі і рэспублікамі федэрацыі.

Да другой групы акалічнасцей, штурхаўшых рэспублікі на шлях аб'яднання, таварыш Сталін адносіў неабходнасць аб'яднанага ваеннага, дыпламатычнага і эканамічнага фронта совецкіх рэспублік перад тварам усяго капіталістычнага свету. Вялікі правадыр партыі і народа папярэджваў аб тым, што, не гледзячы на пераможнае скончэнне грамадзянскай вайны, небяспека нападу з'знову не апала, што акрамя ваеннай небяспекі была небяспека эканамічнага і дыпламатычнага ізалявання совецкіх рэспублік.

Нарэшце, неабходнасць аб'яднання дыктавалася самім характарам совецкай улады, яе класавай прыродай. «Совецкая ўлада пабудавана так, — гаварыў таварыш Сталін,—што яна, інтэрнацыянальная па сваёй унутранай сутнасці, усяляк культывуе ў масах ідэю аб'яднання, сама штурхае іх на шлях аб'яднання».

Характарызуючы сусветна-гістарычнае значэнне рашэння I з'езда Совецаў СССР, які зацвердзіў праект «Дэкларацыі» і «Дагавору аб стварэнні Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік», таварыш Сталін гаварыў:

«Сёнешні дзень з'яўляецца днём таржаства новай Расіі, разбіўшай ланцугі нацыянальнага прыгнечання, арганізаваўшай перамогу над капіталам, стварыўшай дыктатуру пролетарыята, разбудзіўшай народы Усходу, натхняючай рабочых Захаду, ператварыўшай чырвоны сцяг са сцяга партыйнага ў сцяг дзяржаўны і сабраўшай вакол гэтага сцяга народы совецкіх рэспублік для таго, каб аб'яднаць іх у адну дзяржаву, у Саюз Совецкіх Социялістычных Рэспублік, прыабраз налыходзячай сусветнай Совецкай Социялістычнай Рэспублікі».

(Даклад «Аб аб'яднанні совецкіх рэспублік» на Першым з'ездзе Совецаў СССР).

6 ліпеня 1923 года ЦВК СССР прыняў канстытуцыю СССР, у аснову якой былі пакладзены «Дэкларацыя» і «Дагавор аб стварэнні СССР», прынятыя I Усесаюзным з'ездам Совецаў. Канчаткова гэта канстытуцыя была зацверджана 31 студзеня 1924 года II Усесаюзным з'ездам Совецаў. У 1925 годзе ў склад Саюза ССР увайшлі яшчэ Узбекская ССР і Туркменская ССР, а ў 1929 годзе — Таджыкская ССР.

***

15 год, якія адзяляюць нас ад I з'езда Совецаў СССР, запоўнены ўпартай, гераічнай работай і барацьбой народаў СССР за пабудову социялістычнага грамадства. Працоўныя СССР, пад кіраўніцтвам зялізнай і мудрай ленінска-сталінскай большэвіцкай партыі, у жорсткай барацьбе супроць трацкісцка-бухарынскіх здрадніка́ў, буржуазных нацыяналістаў і іншых ворагаў народа пабудавалі социялізм, ператварылі краіну з убогай і бяссільнай у магутную, багатую, квітнеючую социялістычную дзяржаву, у якой няма прыгнечання чалавека чалавекам, няма дзялення на народы пануючыя і народы прыгнечаныя.

У рэзультаце пераможнага ажыццяўлення сталінскіх пяцігодак, індустрыялізацыі краіны і перамогі калгаснага ладу на вёсны совецкая краіна перажывае нябачаны росквіт за ўсіх галінах гаспадаркі і культуры.

На агульным фоне бурнага ўзлыму народнай гаспадаркі ўсёй совецкай краіны асабліва хутка ідзе ўгару развіццё прамысловасці, сельскай гаспадаркі і культуры нацыянальных украін. Ленінска-сталінская нацыянальная палітыка забяспечыла шпаркія тэмпы індустрыялізацыі раней адсталых нацыянальных рэспублік, іх гігантскі гаспадарчы і культурны ўзлым.

Дзякуючы правільнай палітыцы партыі Леніна — Сталіна, знікла былая непрыязнасць і недавер'е да вялікарусаў, узы брацкай дружбы звязваюць украінцаў, казахаў, грузін, кіргізаў і ўсе іншыя народы СССР з вялікім рускім народам, які, як першы сярод роўных у брацкай сям'і народаў, аказваў дапамогу раней адсталым нацыянальнасцям, дапамог ім адрадзіцца да новага жыцця.

Вынікі нацыянальнага будаўніцтва СССР яркa паказаны ў дакладзе таварыша Сталіна аб праекце Канстытуцыі СССР на Надзвычайным VIII Усесаюзным з'ездзе Совецаў.

«У рэзультаце мы маем цяпер зусім склаўшуюся і вытрымаўшую ўсе іспыты шматнацыянальную социялістычную дзяржаву, моцнасці якой магла-б пазайздросціць любая нацыянальная дзяржава ў любой частцы свету».

Сталінская Канстытуцыя развіла і замацавала прынцыпы, на якіх грунтуецца наша шматнацыянальная дзяржава, якая яднае зараз 11 саюзных рэспублік. Выбары ў Вярхоўны Совет СССР праламанстравалі моцнасць і непарушнасць брацкіх уз, звязваючых народы СССР, іх бяжмежную адданасць большэвіцкай партыі і яе правадыру таварышу Сталіну. Маральнае і палітычнае адзінства ўсяго совецкага народа, велізарны рост палітычнай актыўнасці працоўных усіх нацыянальнасцей ярка выявіліся на выбарах у Вярхоўны Совет СССР. За кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных у Совет Саюза аддалі свае галасы 98,6 проц., у Совет Нацыянальнасцей — 97,8 проц. усіх галасаваўшых. Ніколі ні адзін ўрад у свеце не атрымаў такога аднадушнага адабрэння сваёй палітыкі, не апіраўся на такую колькасць выбаршчыкаў, як совецкі ўрад.

Чым больш мацнее і багацее шматнацыянальная совецкая дзяржава, тым больш лютай робіцца нянавісць да яе міжнароднай буржуазіі. Фашысцкія агрэсары ў сзаёй падрыўной рабоце, накіраванай супроць СССР, апіраюцца на сваіх агентаў — буржуазных нацыяналістаў і трацкісцка-бухарынскіх бандытаў. Поллы твурушнічаючы, здрадніцка маскіруючыся, гэтыя агідныя агенты фашысцкіх разведак накіроўвалі сваю шпіёнскую, шкодніцкую і тэрарыстычную дзейнасць на тое, каб адарваць ад СССР Украіну, Беларусь, Узбекістан і іншыя нацыянальныя рэспублікі, аддаць іх на разарванне замежным захватчыкам, аднаць у народаў СССР іх шчаслівае жыццё, зноў надзець на іх ярмо буржуазна-памешчыцкай эксплаатацыі. Не бывань гэтаму! Наша пільная совецкая разведка, кіруемая верным сталінцам Н. І. Ежовым, раскрыла страшэнныя злачынствы гэтых злейшых ворагаў сапружаства народаў, жалезнай рукой разграміла шпіёнска-шкодніцкія гнёзды. Апіраючыся на палтрыманне мільённых народных мас, слаўныя наркамунутзельцы да канца знішчаць буржуазна-нацыяналістычных і трацкісцка-бухарынскіх наймітаў фашызма. Няма такой сілы, якая магла-б пахіснуць магутнасць шматнацыянальнай совецкай дзяржавы, якая ідзе пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна да новых слаўных перамог.

Народы Совецкага Саюза рэальна адчуваюць бліскучыя рэзультаты ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі. Сэрцы працоўных усіх нацыянальнасцей поўны падзякі і гарачай любві да мудрага арганізатара социялістычных перамог і сапружаства народаў — вялікага Сталіна.

Пад ленінска-сталінскім сцягам будзе і далей моцнець брацтва і дружба народаў СССР, будуць множыцца багацці совецкай краіны, асвятляючай працоўным усяго свету шлях да пазбаўлення ад гнёту, галечы і бяспраўя, шлях да ззяючых вяршынь комунізма.

ВЕЛІКА І НЕПАРУШНА СТАЛІНСКАЯ ДРУЖБА НАРОДАЎ СССР

* * *

ГІГАНЦКАЯ СІЛА КРАІНЫ

Пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі мацнее вялікая дружба народаў нашай соцыялістычнай радзімы. Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі і вялікага праводыра працоўных таварыша Сталіна шматнацыянальны 170-мільённы совецкі народ будуе выдатны будынак комунізма.

У сузор'і 11 рэспублік пышна квітнее наша ордэнаносная Совецкая Беларусь. Былая калонія, адсталая, забітая, лапцюжная — Беларусь ператварылася, пры працкай дапамозе зялікага рускага народа, у адну з перадавых рэспублік Саюза ССР.

За годы сталінскіх пяцігодак выраслі ў нас светлыя карпусы фабрык і заводаў, якія выпускаюць складаныя станкі, боўк, піяніны, цэмент, вопратку, абутак і інш.

Рост нашай рэспублікі, яе магутнасць мы бачым на кожнай фабрыцы, кожным заводзе. Вось і наш дрэваапрацоўчы завод імя Молатава. Ён вырас на нашых вачах. З поўсаматужнага прадпрыемства завод ператварыўся ў адно з буйнейшых прадпрыемстваў рэспублікі.

У нашых пэхах працуюць рабочыя розных нацыянальнасцей — беларусы, яўрэі, рускія. Усе мы дружным, адзіным калектывам змагаемся за павышэнне соцыялістычнай прадукцыйнасці працы, за ўмацненне нашага завода.

Я, малады стаханавец, равеснік Вялікага Кастрычніка, вырас у сям'і рабочага-беларуса. Мой бацька з малых год пайшоў працаваць на лесазавод. Ён на сваёй шкіне адчуў лютую эксплаатацыю, нацыянальны гнёт. Даволі сказаць, што ён толькі пры совецкай уладзе атрымаў прафесію качагара, навучыўся грамаце.

Мне ўжо не прышлося прайсці гэты суровы жыццёвы шлях бацькі. Мяне выхавалі комуністычная партыя і совецкая ўлада. Скончыўшы школу ФЗВ, я з 1935 года працую столярам на заводзе імя Молатава. Норму выконваю на 700 проц. Зарабляю па 1000 рублёў у месяц.

Я адзін з мільёнаў совецкіх юнакоў, перад якімі адкрыты шырокія гарызонты. Маладыя людзі капіталістычных краін асуджаны на беспрацоўе, голад і прыгнёбанне. Яны не могуць думаць аб сваім будучым, бо не ўпэўнены нават у заўтрашнім дні.

Моладзь совецкай краіны—самая шчаслівая, здаровая, жыццерадасная моладзь на ўсім свеце.

Сёнешні дзень з'яўляецца вялікім святам для беларускага народа, як і для ўсіх нацыянальнасцей Совецкага Саюза.

Магутнасць нашай краіны заключаецца ў неспаі, непахіснай дружбе ўсіх народаў СССР, яна будзе мацнець яшчэ больш і больш, і гэтую сілу нікому не перамагчы.

Ф. С. КУСКОЎ,
стаханавец менскага дрэваапрацоўчага завода імя Молатава.

ГАРАЧЫЯ ПАТРЫЁТЫ

Мінула 15 год з дня заснавання Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік. Расце і мацнее наша пудоўная соцыялістычная радзіма, атрымала поўную перамогу ленінска-сталінская нацыянальная палітыка. У свяшчэннай і непахіснай дружбе свабодныя народы вялікага Совецкага Саюза будуюць сваё шчаслівае, радаснае жыццё.

Пільна ахоўвае гэтае радаснае жыццё ад капіталістычных драпежнікаў наша слаўная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія.

Штогод краіна пасылае маладое, здаровае папаўненне ў рады Чырвонай Арміі. Штогод лепшыя маладыя сыны нашай радзімы ідуць у вайсковыя вучылішчы, дзе куюцца слаўныя, адданыя справе партыі Леніна — Сталіна камандзіры Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

Адной з кузняў, дзе выхоўваюцца чырвоныя лейтэнанты, з'яўляецца Менскае вайсковае вучылішча імя М. І. Калініна. Сярод курсантаў МВУ ёсць прадстаўнікі розных нацыянальнасцей — беларусы, рускія, украінцы, марыйцы, яўрэі і інш. Усе яны жывуць дружнай сям'ёй, дапамагаюць адзін аднаму ў вучобе. Няма паміж імі ніякай нацыянальнай розні. І рускі з Калінінскай ці Маскоўскай вобласці, і украінец з паўднёвых стэпаў, і беларус з аброджанага Палесся, і марыец з горнага Прыволжскага края, — усе жывуць выключна сяброўскім і дружным калектывам. Яны горача любяць сваю радзіму, ганарацца магутнасцю і багаццямі яе.

Усе яны добра ведаюць, якое праклятае жыццё было ў старой царскай Расіі, ведаюць па расказах бацькоў. Вось украінец тав. Мельнік. Яго бацька пазнаваў усё жыццё да 1917 года бэтраком у украінскіх кулакоў і памешчыкаў, а сям'я ніколі не наядалася ўдосыць хлебам. Вось марыец тав. Пронін, бацька якога да рэвалюцыі не меў кавалка зямлі. Тав. Пронін добра ведае, як іх, марыйцаў, прыгнятаў царскі ўрад, як смяяліся і здзекаваліся з іх. Вось беларус тав. Слаўны. Яго бацькі гнулі спіну да рэвалюцыі на кулакоў, а малыя дзеці сядзелі ў халоднай хаце, чакалі, покуль бацька прынясе потам і кроўю зароблены кавалак сухога хлеба.

Зараз і тав. Мельнік, і тав. Пронін, і тав. Слаўны вучацца разам у вайсковым вучылішчы. Як прыкладныя ў вучобе і дысцыпліне, яны назначаны малодшымі камандзірамі, будуць вучыць маладых курсантаў.

Кожны чэсны грамадзянін Совецкага Саюза — гарачы патрыёт сваёй радзімы, глыбока і беззаветна адданы большэвіцкай партыі, вялікаму Сталіну. Кожны з нас гатоў за сваю соцыялістычную радзіму аддаць усе сілы, усё жыццё.

Курсант МВУ С. І. БРЫЖАНЬ.

* * *

ПРАЎДА І ШЧАСЦЕ

У рэзультаце ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі Беларусь ператварылася ў квітнеючую роўнапраўную соцыялістычную рэспубліку з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, якія маюць прафесароў і лацэнтаў, вышаўшых з народа і падрыхтаваных на месцы ў Беларусі. Беларусь атрымала сваіх настаўнікаў, урачоў, аграномаў, інжынераў — з рабочых і сялян, стварыўшых новую совецкую інтэлігенцыю.

Беларусь атрымала свае драматычны і оперны тэатры, сваю кансерваторыю, сваіх народных паэтаў і артыстаў, атрымала поўную магчымасць вырошчвань сваіх музыкантаў, спевакоў і пісьменнікаў.

Дружба народаў згуртавала вакол сцяга Леніна—Сталіна ўсе нацыянальнасці нашай вялікай радзімы і зрабіла СССР непрыступнай крэпасцю для ўсіх ворагаў соцыялізма, адкуль-бы яны ні паявіліся.

Бясспрыкладныя ў гісторыі бліскучыя рэзультаты выбараў у Вярхоўны Совет паказалі працоўным усяго свету, што брацтва народаў СССР ёсць адзіная крыніца для запвяржэння на зямлі праўды і шчасця. Выбары ў Вярхоўны Совет указалі ўсяму чалавецтву, што толькі дружба працоўных усіх нацый зможа раздуць полымя сусветнай рэволюцыі і запверзіць на земным шары для ўсіх грамадзян справядлівае і шчаслівае жыццё пад кіраўніцтвам слаўнай комуністычнай партыі.

Праф. С. М. МЕЛКІХ.

У СССР Я ЗНАЙШОЎ СВАЮ РАДЗІМУ

Да рэволюцыі цыганы не мелі ніякіх чалавечых правоў. Век свой яны вандравалі па свету і жабравалі. Шацёр і калёсы — увесь быў скарб цыганскі. Так жыў і я. Жыццё было невыносна цяжкім, дзікім. Давялося мне быць і ў царскай арміі. Кожны начальнік лічыў сваім абавязкам здзекавацца над табой і біць толькі за тое, што ты цыган.

З усім гэтым назаўсёды пакончыў Вялікі Кастрычнік.

Я ганаруся тым, што мне давялося з вінтоўкай у руках змагацца на фронце з белымі бандамі, граміць чорныя атрады буржуяў і памешчыкаў, заваёўваць светлае жыццё. У гэтай вялікай бойцы вырас і ўмацаваўся непахісны саюз народаў СССР, іх вялікая, кроўная, неразрыўная дружба. У гэтым вялікім саюзе наша Совецкая Беларусь, пры дапамозе вялікага рускага народа, пад кіраўніцтвам слаўнай партыі Леніна — Сталіна, ператварылася ў квітнеючую краіну.

Усе мы жывем па Сталінскай Канстытуцыі, адчуваем асалоду чалавечага жыцця. І я, цыган, поўнасцю карыстаюся гэтымі вялікімі правамі грамадзяніна СССР.

З'яднаныя вялікім Сталіным народы СССР заваявалі нябачаныя ў свеце правы. Я стаў рабочым соцыялістычнага прадпрыемства, гаспадаром, атрымаў сваю радзіму. Сям'я мая жыве шчасліва, як і ўвесь наш совецкі народ. Дзеці вучацца ў школах, сам я ліквідаваў сваю непісьменнасць. Я ўступіў у спачуваючыя ВКП(б), бо няма і не можа быць у мяне іншага шляху, як шлях партыі Леніна—Сталіна.

Наша дружба непарушна. За гэту дружбу таму, хто даў яе нам, любімаму Сталіну — вялікая слава. За гэту дружбу я гатоў, як і ўвесь наш народ, у любую мінуту аддаць усе сілы і жыццё.

БАРАНОЎСКІ Агей Фёдаравіч,
рабочы прадальнага корпуса магілеўскай шаўковай фабрыкі імя Куйбышава.

В. ЛЕБЕДЗЕЎ-КУМАЧ

НАША МАСКВА

Шмат на карце кропак дробных,
Горных пікаў і нізін, —
Але сэрцу самы родны
З тых кружочкаў ёсць адзін.

Горад гэты — яснацветы —
Светлай Волгі сінява, —
Наша сіла — Масква,
Наша слава — Масква,
Наша гордасць — прыгожая
Масква!

Большэвіцкая краіна
Гордым гімнам родных моў,
Песняй маці, песняй сына
Ёй выказвае любоў.

Горад гэты — яснацветы —
Роднай Волгі сінява, —
Наша сіла — Масква,
Наша слава — Масква,
Наша гордасць — прыгожая
Масква!

Акцябронак хоча ведаць,
Ледзь пачаўшы гаварыць,
Дзе Масква, што над сусветам
Яснацветам зор гарыць.

Горад гэты — яснацветы —
Светлай Волгі сінява, —
Наша сіла — Масква,
Наша слава — Масква,
Наша гордасць — прыгожая
Масква!

У паветры, пад вадою,
Ці на полюсе сівым
Мы з далёкаю Масквою
Сэрцам злучаны адным.

Горад гэты — яснацветы —
Роднай Волгі сінява, —
Наша сіла — Масква,
Наша слава — Масква,
Наша гордасць — прыгожая
Масква!

Мы працуем для радзімы
Ад зары і да начы,
Дзе-б далёка ні жылі мы,
Ўсе мы сэрцам масквічы!

Горад гэты — яснацветы —
Светлай Волгі сінява, —
Наша сіла — Масква,
Наша слава — Масква,
Наша гордасць — прыгожая
Масква!

Стаць гатовы люд працоўны,
Як да зброі пазавуць, —
Пад дзяржаўны сцяг чырвоны
За таварыша — Маскву!

Горад гэты — яснацветы —
Роднай Волгі сінява, —
Наша сіла — Масква,
Наша слава — Масква,
Наша гордасць — прыгожая
Масква!

З рускай мовы пераклаў
АРКАДЗЬ КУЛЯШОЎ.

* * *

БУДУ АХОЎВАЦЬ СВАЮ РАДЗІМУ

Пры праклятым парызме нас, татар, не лічылі за людзей, здзекваліся над намі, абманвалі на кожным кроку.

У нашай вёсцы Ермакееўскай жыў памешчыкУлтаў, які меў некалькі сотень дзесяцін зямлі, свой памешчыцкі маёнтак. Ён люта эксплаатаваў батракоў, бяднейшых сялян. Мой бацька працаваў у гэтага памешчыка, гнуў спіну ад самай раніцы да позняй ночы за 25—30 капеек у дзень. Маці хадзіла на пазённыя работы. Бацька і маці былі непісьменнымі. Школы ў вёсцы не было, замест яе была мячэць, дзе мулы дурманілі прапоўны народ.

Цяпер, дзякуючы клопатам вялікага Сталіна і ажыццяўленню ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, наша вёска стала непазнавальнай. Замест старых, разробленых гаспадарак у нас большэвіцкі калгас. Цяпер мы маем свой дом, карову, свіней, дробную птушку. У гэтым годзе наша сям'я выпрацавала 600 працадзён.

Цяпер я магу з гонарам заявіць, што наша сям'я жыве культурна і заможна. Мае бацька і маці навучыліся чытаць і пісаць.

Я знаходжуся ў радах нашай Чырвонай Арміі, і я ганаруся высокім званнем байца-чырвонаармейца. Са зброяй у руках я моцна буду ахоўваць соцыялістычную радзіму, шчаслівае жыццё, заваёванае нашымі бацькамі. Я ведаю, што служба ў Чырвонай Арміі ёсць ганаровы абавязак кожнага грамадзяніна СССР.

НУРСАІД АРСЛАМАЎ.

Я ГАНАРУСЯ СВАЁЙ РАБОТАЙ

Царскі ўрад нацкоўваў адну нацыянальнасць на другую, сеяў вякамі розань, нянавісць сярод народаў старой Расіі. Лютая эксплаатацыя працоўных капіталістамі і памешчыкамі прыводзіла да вымірання многіх народнасцей.

Аб асвеце пры парызме працоўныя татары, кіргізы, армяне, калмыкі, беларусы і многія іншыя нацыянальнасці нават і марыць не маглі. Для іх дарога ў школы была закрыта. Паны, кулакі, баі — вось з якога асяроддзя расла тады інтэлігенцыя, абараняўшая інтарэсы капіталістаў, памешчыкаў і кулакоў.

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя паклала канец соцыяльнаму і нацыянальнаму гнёту. Вялікая партыя Леніна—Сталіна забяспечыла кожнай нацыянальнасці роўнапраўе. У вялікім Совецкім Саюзе з кожным днём усё больш мацнее дружба паміж народамі.

За 15 год існавання СССР значна вырасла інтэлігенцыя з рабочых і сялян ва ўсіх нацыянальных рэспубліках. Інтэлігенцыя, якая кроўнымі ніцямі звязана з народам, беззаветна служыць справе соцыялізма.

Я, настаўніца-беларуска, інтэлігент краіны Советаў. Я ганаруся тым, што мне даверылі адказнейшы ўчастак работы — выхаванне совецкай дзетвары, выхаванне людзей сталінскай эпохі. Мне 25 год, і з іх 8 год я працую настаўніцай. Усе сілы, усе свае здольнасці я аддаю і буду аддаваць справе далейшага росквіту нашага вялікага Совецкага Саюза.

Няхай запомняць ворагі, што ім ніколі не ўдасца парушыць песную дружбу народаў СССР. А тыя, хто паспрабуе ўбіць клін у дружбу народаў, будуць сцёрты з твару совецкай зямлі.

В. А. ЛАГУТА,
настаўніца 45 менскай школы.

* * *

РАСЦЕ КРАІНА, РАСТУЦЬ ЛЮДЗІ

15 год з дня стварэння СССР — якая слаўная і вялікая дата! Як многа зроблена за гэты кароткі гістарычны тэрмін, якія бліскучыя перспектывы наперадзе! Пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі шчасліва і радасна зажылі ўсе народы вялікага СССР.

Я рос і выхоўваўся ў Беларускай рэспубліцы. Рэспубліка накіравала мяне вучыцца ў сталіну Саюза — Маскву. Інстытут я паспяхова скончыў, і мяне, па маёй просьбе, накіравалі на будаўніцтва гомельскага шклозавода.

1932 год. Будаўніцтва ў разгары. На палях, якімі калісьці ўладаў барон Нолькен, сталі хутка вырастаць велізарныя карпусы шклозавода—буйнейшага ў СССР. Выраслі высокія карпусы рабочага пасёлка. Брацкія саюзныя рэспублікі сачылі за нашым будаўніцтвам і аказвалі нам дапамогу. Рускія і украінскія рабочыя пасылалі нам абсталяванне для завода, пасылалі людзей, знаёмых з тэхнікай вытворчасці на механізаваных шклозаводах.

1933 год. Задымілася трубы завода. У дзень вялікай галавіны Кастрычніцкай рэволюцыі завод выпусціў першыя лісты шкла. З гэтага моманту прайшло ўсяго 4 годы. А якія велізарныя змены ў жыцці завода, у жыцці людзей!

Рос завод, раслі і людзі. Інжынер па мантажу, дзяжурны інжынер, начальнік лабараторыі, начальнік цеплатэхнічнага бюро—вось мой вытворчы шлях. Раслі таварышы па рабоце: інжынер Карнееў, сын селяніна-бедняка ў мінулым, зараз начальнік аднаго з важнейшых цэхаў завода—газагенератарнай станцыі. Інжынер Фральцоў, у мінулым беспрытульны, зараз начальнік састаўнога цэха. Інжынер Папоў—спрадвечны пролетарый—зараз загадчык вытворчасці ўсяго завода. Іх жыццёвы шлях—шлях многіх людзей нашай краіны соцыялізма.

І калі ворагі адважацца пасягнуць на наша шчаслівае і радаснае жыццё, то па закліку партыі, па закліку любімага Сталіна і тав. Варашылава ў шэрэнгу байцоў, разам з усім калектывам нашага завода, разам з усім многамільённым народам вялікага Совецкага Саюза, стану і я, камандзір запаса, інжынер, выхаваны партыяй і ленінскім комсамолам.

Пётр Нікалаевіч ШТЭРНОЎ,
інжынер гомельскага шклозавода імя Сталіна.

ВЫРАСЛА НОВАЯ ВЁСКА

Царская ўлада нацкоўвала адзін народ па другі і прыгнечвала нацыянальныя меншасці. Мы ніколі не забудзем той пракляты час, калі беларусы баяліся называць сябе беларусамі.

І вось ужо дваццаць першы год народы Совецкага Саюза жывуць у вялікай брацкай дружбе і дапамагаюць адзін другому будаваць новае жыццё.

Я — беларус і я шчаслівы і горды тым, што з'яўляюся грамадзянінам СССР, грамадзянінам БССР. Партыя большэвікоў, наш дарагі бацька таварыш Сталін заўсёды клапаціліся аб умацаванні дружбы паміж народамі. Іменна яна дала магчымасць ператварыць адсталыя ў мінулым нацыянальныя ўскраіны ў магутныя квітнеючыя совецкія рэспублікі.

Была наша Беларусь цёмнай і забітай, а цяпер куды ні глянь — усюды жыццё новае, прыгожае, радаснае. Новыя заводы, фабрыкі, школы, клубы, універсітэты. Далёка за прыкладамі не трэба хадзіць. Вазьму нашу вёску Ушень, Церахоўскага раёна, у якой я жыву ўсе годы. Была яна ў мінулым такая-ж цёмная і забітая, як і ўся доля сялянская пры царскім рэжыме.

Цяпер наша вёска — гэта калгас «Большэвік». Раней селянін гнуў спіну над сахой, а цяпер нашу калгасную зямлю, якая аддана нам навечна, апрацоўваюць трактары. Ёсць у нас і такія сельскагаспадарчыя машыны, як малатарні, веялкі, касілкі і інш.

Раней у нашай вёсцы была царкоўнаприходская школа, у якой навучалася 100 дзяцей, ды і то заможных бацькоў. Зараз у школе навучаецца 400 дзяцей. Пра газеты мы нават і не чулі. Цяпер у нас кожны калгасны двор атрымлівае газеты, журналы. Мы не ведалі пра радыё, тэлефон, кіно — усё гэта ёсць цяпер у нашай вёсцы. Пра адукацыю мы толькі марыць маглі. Я сам за свае сорак год толькі тры зімы правучыўся. А нашым дзецям усе навучальныя ўстановы даступны. Вось я прыблізна падлічыў, колькі пры совецкай уладзе вышла вучоных людзей з нашай вёскі: 10 настаўнікаў, 5 камандзіраў Чырвонай Арміі, 6 інжынераў і тэхнікаў. Апрача таго, добрых два дзесяткі дзяцей калгаснікаў вучацца ў гарадах — у тэхнікумах і універсітэтах.

Жыццё з кожным годам становіцца больш заможным. Я выпрацаваў у гэтым годзе 450 працадзён, а жонка мая —150. Мы атрымалі многа хлеба, бульбы, грошай. Толькі ў калгасе я—былы батрак—дабіўся багатага жыцця.

Усё гэта магчыма толькі ў нашай совецкай краіне, у СССР, дзе ёсць брацкая дапамога адной рэспублікі другой, дзе ёсць наша моцная дружба, дзе ўсе народы ідуць пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна да новых перамог. Гэту дружбу нікому і ніколі не ўдасца парушыць. Калі вораг пасмее толькі напасці на нашу шчаслівую радзіму, мы ўсе, дружаай сям'ёй народаў СССР, станем грудзьмі на абарону нашай дарагой соцыялістычнай бацькаўшчыны.

АБУШЭНКА Іван Осіпаў,
калгаснік калгаса «Большэвік», Уняўскага сельсавета, Церахоўскага раёна.

ТРЫУМФ ЛЕНІНСКА-СТАЛІНСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя разбіла «турму народаў», якою з'яўлялася Расія памешчыкаў і капіталістаў. «Народы-парыі, народы-рабы ўпершыню ў гісторыі чалавецтва падняліся да становішча народаў сапраўды свабодных і сапраўды роўных, заражаючы сваім прыкладам прыгнечаныя народы ўсяго свету» (Сталін).

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя знішчыла ўладу памешчыкаў і капіталістаў, знішчыла сістэму эксплаатацыі і тым самым ліквідавала назаўсёды каланіяльнае рабства і нацыянальнае прыгнечанне. Ленінска-сталінская нацыянальная палітыка згуртавала 175 народаў і плямён совецкай краіны ў адзіную дружную сям'ю працаўнікоў соцыялістычнага грамадства.

«З часу ўтварэння совецкіх рэспублік, — гаварыў таварыш Сталін на X Усерасійскім з'езде Советаў 26 снежня 1922 г.,—дзяржавы свету разбіліся на два лагеры: на лагер соцыялізма і на лагер капіталізма. У лагеры капіталізма мы маем імперыялістычныя войны, нацыянальную рознь, прыгнечанне, каланіяльнае рабства і шавінізм. У лагеры Советаў, у лагеры соцыялізма, мы маем, наадварот, узаемнае давер'е, нацыянальную роўнасць, мірнае сужыццё і брацкае супрацоўніцтва народаў».

Бачучыся развіцця рабочага руху на «ўскраінах», царскія сатрапы ўсямерна стараліся трымаць Беларусь на ўзроўні сярэдневякоўя, увекавечыць яе гаспадарчую і культурную адсталасць. У рэзультаце гэтай палітыкі ў межах сучасных граніц БССР на 4,7 мільёна насельніцтва мелася ў той час усяго каля 20 тысяч рабочых поўсаматужных прадпрыемстваў, на якіх праводзілася дзікая эксплаатацыя, пры 12—14-гадзінным рабочым дні.

Каласальная прамысловая адсталасць старой Беларусі суправаджалася ўсеўладствам памешчыка і кулака ў вёсцы і велізарным аграрным перанасяленнем. З 22 мільёнаў дзесяцін зямлі 12 мільёнаў дзесяцін знаходзілася ў руках памешчыкаў і толькі 10 мільёнаў, г. зн. 45 проц., належала 4 мільёнам сялянскага насельніцтва. Звыш 200 тысяч батракоў стзаралі багацці памешчыкам і кулакам, якія, апрача таго, трымалі ў поўнай кабале больш 60 проц. сялянскіх гаспадарак.

Каланіяльны разбой і нацыянальны гнёт знаходзілі сваё яркае выражэнне ва ўстанаўленні «черты оседлости» для яўрэйскіх прапоўных мас, у сістэматычным напкоўванні адной нацыянальнасці на другую, у жудаснай арганізацыі пагромаў і, нарэшце, у поўнай забароне роднай мовы.

У беларускага народа было зусім адабрана права на родную мову, а тым больш на друкаванае слова на роднай мове. Рускае-ж слова афіцыйна даходзіла да прапоўных толькі ў паліцэйска-прапоўскім чорнасоценным духу. Звыш 70 проц. насельніцтва Беларусі былі зусім неісьменныя, а з 30 проц. пісьменных добрую палову стварала армія каланізатараў і эксплаататарскія класы Беларусі. Калі да гэтага дадаць, што ў Беларусі не было ні адной ВНУ, ні адной навукова-даследчай установы, то ўзровень развіцця культуры ў старой Беларусі будзе ясным.

Такім бязрадасным было становішча прапоўных мас Беларусі пад уладаю памешчыкаў і капіталістаў, пад уладаю каланізатараў.

У рэзультаце перамогі Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, пры велізарнай дапамозе рускага рабочага класа рускага народа, беларускі народ заваяваў сваё вызваленне ад каланіяльнага заняволення, нацыянальнага гнёту, ад улады і эксплаататараў памешчыкаў і капіталістаў. Сталінскім геніем і клопатамі народжана свабодная Совецкая Беларусь.

Пры велізарнай брацкай дапамозе рускага рабочага класа, пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, беларускі народ ліквідаваў сваю гаспадарчую і культурную адсталасць, ператварыўшы сваю краіну ў адну з перадавых совецкіх рэспублік, дабіўшыся заможнага, радаснага жыцця.

Нябачанымі тэмпамі расла гаспадарчая магутнасць Совецкай Беларусі. У рэзультаце правядзення ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі яна ператварылася з адсталай аграрнай «ускраіны» ў краіну з развітай буйнай прамысловасцю. За годы совецкай улады, за годы сталінскіх пяцігодак прамысловая прадукцыя БССР узрасла ў 22 разы ў параўнанні з 1913 годам і дасягнула 73 проц. агульнай прадукцыі народнай гаспадаркі БССР.

У корані змянілася беларуская вёска. Адышла ў беззваротнае мінулае разам з сахой беспрасветная галеча і цемната беларускага селяніна. У 10 тысячах калгасаў і соўгасаў будуюць сваё шчаслівае жыццё соцыялістычныя прапаўнікі беларускай вёскі. Совецкая ўлада ўзброіла іх тысячамі трактараў і камбайнаў, многімі тысячамі розных машын. На аснове перамогі калгаснага ладу, на аснове правядзення ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, якая выражаецца ў велізарнай дзяржаўнай дапамозе Совецкага Саюза, калгаснае сялянства Совецкай Беларусі цвёрда стала на шлях забяспечанага заможнага, культурнага жыцця.

Ленінска-сталінская нацыянальная палітыка прывяла да нябачанага росквіту культуры ў Совецкай Беларусі—культуры, нацыянальнай па форме, соцыялістычнай па зместу. Выраслі новыя нацыянальныя кадры соцыялістычных прапаўнікоў горада і вёскі. Непісьменнасць і цемната—сродак памешчыкаў і буржуазіі для эканамічнага і палітычнага закабалення прапоўных—ліквідаваны чазаўсёды. З краіны з 70 проц. непісьменных Совецкая Беларусь ператварылася ў краіну супэльнай пісьменнасці. Совецкая ўлада адкрыла шырачэзны шлях да вышэйшай асветы. 22 ВНУ, 72 тэхнікумы, 20 рабфакаў куюць работнікаў з вышэйшай і сярэдняй асветай з асяроддзя прапоўных розных нацыянальнасцей для ўсіх галін народнай гаспадаркі і культуры.

Толькі пры совецкай уладзе беларускі народ атрымаў магчымасць карыстацца друкаваным словам на роднай мове. Звыш 200 газет з 700-тысячным тыражом, сотні назваў кніг з вялізным тыражом твораў класікаў марксізма-ленінізма, тысячы назваў кніг па розных галінах ведаў абслугоўваюць каласальна ўзрослыя культурныя запросы прапоўных БССР.

Прапоўныя Совецкай Беларусі ведаюць, што ад эксплаатацыі памешчыкаў і капіталістаў, ад галечы і голаду, ад каланіяльнага рабства і нацыянальнага гнёту іх вызваліла Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя. Яны ведаюць, што толькі ў вялікай брацкай сям'і народаў Совецкага Саюза яны знайшлі сапраўды чалавечае жыццё. Яны ведаюць, што да гэтага жыцця іх прывяла партыя Леніна—Сталіна. Яны ведаюць, што творцам гэтага жыцця, найвялікшым другам усіх прапоўных народаў, кіраўніком соцыялістычных перамог з'яўляецца таварыш Сталін. І вось чаму ўвесь беларускі народ 12 снежня аднадушна галасаваў за сталінскі блок комуністаў з беспартыйнымі.

Ворагі народа, беларускія нацыянал-фашысты, разам з фашысцкай бандай трацкістаў-бухарынцаў, прабавалі падарваць соцыялістычныя заваяванні беларускага народа, адарваць Совецкую Беларусь ад Совецкага Саюза, растаўраваць уладу памешчыкаў і капіталістаў, ператварыць нашу квітнеючую, радасную краіну ў калонію германа-польскага фашызма. Але працоўныя Совецкай Беларусі з дапамогаю совецкай разведкі, кіруемай тав. Ежовым, выкрылі і разбавілі подлую фашысцкую гадзіну. Адчуваючы на сваім уласным прыкладзе шчаслівага, культурнага жыцця плады ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, беларускі народ ніколі не адласць сваіх заваяванняў.

Разам з усімі народамі Совецкага Саюза, пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, ён пойдзе да новых перамог соцыялізма. І калі асатанелы фашызм асмеліцца крануць совецкую зямлю, беларускі народ будзе ў першых баявых радах за справу соцыялізма, за вялікі Совецкі Саюз, за сусветную соцыялістычную рэволюцыю.

П. В. САЕВІЧ.

Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «Чырвоны партызан», Траскоўскага сельсовета, Заслаўскага раёна, — лепшыя выканаўцы беларускіх народных танцаў і песень.
Фото Б. Вернера (БСФ).

ЛЯВОНІХА
(НА НАРОДНЫ МАТЫЎ)

Эх, Лявоніха, якая-ж ты цяпер!
Не пазнаць цябе, Лявоніха, павер, —
Буйна-буйна тваё шчасце зацвіло,
Як-бы й долі ў цябе горкай не было.
Завяла ты для сябе калгасны лад,
І цвіце ён, як цудоўны любы сад.
Стала жыць табе ўжо лепш і весялей
Ды пашло ў пябе ўсё так, як у людзей:
Стаў стаханаўцам заможным твой
Лявон—
Закупіў табе шмат кніг і патэфон,
Ты-ж, адзета ў розных колераў шаўкі,
Славіш песняй свае новыя дзянькі.
Атрымала ад дзяржавы ты свае
Канстытуцыю, якая табе ўсе
Забяспечвае правы на ўвесь твой век —
Ці-ж мог мець яе ранейшы чалавек!
І сягоння ў нас празмерна кожны рад,
Што па ёй ты ўжо абрала свой урад,
Бо ў совеце ёсць наш слаўны дэпутат—
Ён так блізкі, ён так родны нам усім,—
Гэта лепшы вучань Сталіна—наш Клім.
Эх, Лявоніха, якая-ж ты цяпер!
Не пазнаць цябе, Лявоніха, павер, —
У прыгожую святліцу кожны дзень
Заглядае светла-сонечны прамень,
Расплываецца наўкруг яго святло,
Як-бы й хаткі ў цябе курнай не было.
У святліцы на стале ляжыць пірог,
Масла, сала, мёд, варэнне і тварог.
Ты паклікала за стол к свайму дабру
Катэрыну—сінявокую сястру —
І ад раласнай сустрэчы ў гэты час
Вы, абняўшыся, пашлі ў вясёлы пляс:
Эх, сястрыца, Катэрына,
Сінявокая Украіна,
Патанцуем, пагуляем,
Мы на шчасце права маем.
Не пакінем мы на полі
Незасееных прагалін,
Бо прывёў нас к светлай долі
Наш любімы родны Сталін.
Больш не прызе ў нашы хаты
Лёс, адвечнасцю пракляты.
Мы зрадніліся з табою
І з вялікаю Масквою,
Стаў нам родным армянін,
Кабардзінец і грузін...
Ды не толькі мы з табою
Сталі кроўнаю раднёю —
Адзінаццаць нас усіх,
Блізкіх, родных, дарагіх,
Моцных, статных, смелых, мужных
У такой сястрынай дружбе.
Станцавала Лявоніха гапака
Ды размову аб жыцці зноў павяла,
Расказала яна украінскай сястры,
Што ўжо явай сталі мары яе й сны,
Што ўсе дужымі жывуць яе сыны,
Песні звонкія пра Сталіна пяюць
І рэспубліку да новых зор вядуць.
Рвецца радасць на прастор з тваіх
грудзей,
Што займела яшчэ больш сабе дзяцей.
А дзяржава дужа ласкавай была —
Гадаваць іх табе грошай шмат дала.
Многа, многа ў цябе рознага дзбра.
Ды няшіхая, Лявоніха, пара:
Ходзіць вораг, прытаіўшыся як гад —
Ён дабру твайму, Лявоніха, не рад,
Пільна, зорка аглядай ўсё кругом,
Каб у твой, заліты сонцам увесь, дом
Не прышла якая пакасць з воўчых нор
І не запяміла твайго шчасця ясных зор—
Не здарма-ж ты пралівала сваю кроў
За Кастрычнік і за малалосць сыноў.
Ты жывеш у роднай сталінскай сям'і
Роўнапраўнай гаспадыняю зямлі,
Светлых фабрык, домнаў, шахт і гарадоў,
Гаспадыняй нашых раласных гадоў.
Дзякуй Сталіну і партыі за ўсё—
За прыгожае шчаслівае жыццё,
За расцвіўшыя ў рэспубліцы сады
І за тое, што ў нас кожны малады.
Эх, Лявоніха, якая-ж ты цяпер!
Не пазнаць цябе, Лявоніха, павер, —
Ордэн Леніна ты носіш на грудзях,
Ой, пашаны табе многа на людзях.

ТОДАР АЛЕСІН.

РАДАСНАЯ СУСТРЭЧА НОВАГА ГОДА

Весела сустрэнуць новы год працоўныя сталіцы БССР. Прадпрыемствы, клубы, школы наладжваюць ёлкі, балы-маскарады, вечары мастацкай самадзейнасці.

Моладзь станкабудаўнічага завода імя Варашылава 31 снежня арганізуе вялікі вечар на тэму «Партыя Леніна—Сталіна—арганізатар нашых перамог» і «1938 год будзе годам новых вытворчых перамог».

Файе клуба завода прыгожа дэкарыруецца. Тут будуць вялікія грыбы-бяседкі, кіёскі для продажу канфеці, пакой смеху і інш.

Калі на Крэмлёўскай вежы праб'е 12 гадзін ночы, пачнецца мітынг.

Пасля мітынга выступяць артысты Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета. Харавы гурток завода выканае песні аб Канстытуцыі, аб вялікім Сталіну. Духавы аркестр выканае юбілейны марш Іпалітава-Іванова, прысвечаны таварышу Варашылаву.

Раніцай 1 студзеня для дзяцей рабочых завода наладжваецца новагодняя ёлка. Вучні філіяла музычнай школы пры заводскім клубе рыхтуюць рознастайныя выступленні. Увечары адбудзецца сход рабочых, прысвечаны вынікам 1937 года. Лепшыя стаханаўцы будуць прэміраваны. Заводу будзе ўручан дыплом за экспанаты, прадстаўленыя на выстаўцы «БССР за 20 год».

250 дзяцей работнікаў Дзяржгандлю збяруцца 31 снежня на новагоднюю ёлку ў свой клуб. Тут ім будуць разданы новагоднія падарункі. Дзіцячы балетны гурток клуба выканае рад народных танцаў.

Увечары для работнікаў Дзяржгандля наладжваецца вечар, танцы, бой канфеці і іншае.

***

ВІЦЕБСК. У вітрынах магазінаў—прыгожыя ёлкі. Яны свецяцца ад рознакаляровых лямпачак, рознастайных бліскучых цацак—пазалочаных арэхаў, зорак, рыбак і люстраных шарыкаў. Маленькія дзеці з захапленнем углядаюцца ў вітрыны.

Ля прылаўка адзела казак гарадскога універмага — вялікае ажыўленне. Дарослыя і дзеці купляюць казкі і пацкі. 28 снежня тут прадана тавараў на 2.500 рублёў.

Такое-ж ажыўленне ў большасці магазінаў горада. Рабочыя і калгаснікі набываюць музыкальныя інструменты, мэблю, вопратку. 28 снежня выручка магазіна Ваентандля № 1 у параўнанні з іншымі днямі падвоілася. У кандзіцерскія магазіны паступіла шмат заказаў на кексы, торты, крэндзелі і іншыя кандзіцерскія вырабы для новагодніх вечароў.

Вялікая радасць чакае дзяцей дэпутата Вярхоўнага Совета тав. Власенкава Кірылы Патапавіча. 30 снежня ён заканчвае вучобы на курсах калгаснага актыва і прыязджае на свята ў свой калгас. Кірыл Патапавіч накупіў шмат цацак і казак для дзяцей.

ВЫТВОРЧЫМІ ПЕРАМОГАМІ СУСТРАКАЮЦЬ 1938 ГОД

БАБРУЙСК. (Спец. кар. «Звязды»). Стаханаўцы, рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі прадпрыемстваў горада Бабруйска шырока разгарнулі работу за дастойную сустрэчу новага 1938 года.

Калектыў рабочых мэблевай фабрыкі імя Халтурына, датэрмінова выканаўшы свой галавы план, абавязаўся да канца года даць краіне звыш плана прадукцыі на 1,2 мільёна рублёў. 28 снежня сваё абавязацельства фабрыка перавыканала, даўшы звыш плана прадукцыі на 1.229 мільёнаў рублёў.

На фабрыцы пастуць рады стаханаўцаў. Рэзчык па дрэву тав. Кац у апошнія дні дае рэгулярна 4,5—5 норм. Ён заробляе за змену 90 руб. Рэзчык па дрэву тав. Лапаценка штодзённа дае 4 нормы, яго заробак — 73 руб. за змену. Стаханаўцы тт. Альштуль і Аксельрод за 7 гадзін працы выконваюць па тры нормы, стаханаўка тав. Шарамет Паша — 2—3 нормы.

ЗІМОВЫЯ КАНІКУЛЫ Ў ШКОЛАХ

Ва ўсіх школах Магілева пачатак зімовых канікул будзе адзначан новагодняй ёлкай. Школьнікі актыўна рыхтуюцца да яе, развучваюцца песні і вершы. Гурткі дзіцячай самадзейнасці рыхтуюць выступленні.

6 студзеня для вучняў старэйшых класаў будзе арганізаван вечар-маскарад 7 студзеня ў гарадскім тэатры для школьнікаў малодшых класаў адбудзецца вечар вучнёўскай самадзейнасці.

На працягу канікулаў рускі драматычны дзяржаўны тэатр БССР пакажа школьнікам п'есы «Вочная стаўка» — братоў Тур і Шэйніна і «Слава» — Гусева. Кіно «Чырвоная зорка» наладжвае для дзяцей дзённыя кіносеансы.

90 выдатнікаў вучобы з 1 па 12 студзеня будуць адпачываць у Доме адпачынку ў Пячорску. («К. М.»).

ПОСПЕХ БЕЛАРУСКАГА ВАКАЛЬНАГА АНСАМБЛЯ Ў МАСКВЕ

Па запрашэнню Ўсесаюзнага радыёкамітэта ў Маскву выехаў вакальны ансамбль беларускага радыёкамітэта пад кіраўніцтвам тав. Кляуса. Гэты ансамбль прымаў удзел ва ўсесаюзным радыёфестывалі народнай творчасці, які быў арганізаван у адзнаку 20-годдзя Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэвалюцыі.

27 снежня ансамбль у ліку другіх калектываў спевакоў і музыкантаў брацкіх рэспублік з поспехам выступаў у Цэнтральным Доме Чырвонай Арміі. Ансамбль выканаў дзве беларускія і тры яўрэйскія песні ў апрацоўцы беларускіх кампазітараў Любана, Туранкова і Палонскага. Канцэрт трансліраваўся па СССР. За час прабывання ў Маскве ансамбль выступіць яшчэ ў студыі Ўсесаюзнага радыёкамітэта і на некаторых прадпрыемствах.

СЛУЦКІЯ ВЫШЫВАЛЬШЧЫЦЫ

Случчына здаўна славіцца сваімі вышывальшчыцамі. Слуцкія паясы вядомы далёка за межамі БССР. Дзесяткі і сотні жанчын паказваюць свае мастацтва ў вышыванні.

Як паведамляе газета «Праўда на рубяжы» з 1937 года ў Слупку арганізавана і працуе акруговае вышывальнае таварыства імя Першага мая, якое яднае 180 чалавек. Брыгады вышывальшчыц арганізаваны ў мястэчку Семежаве, у Чырвонай Слабадзе, Старобіне. Многія хатнія гаспадыні з вялікай любоўю і майстэрствам працуюць па вышыванню.

У 1938 годзе таварыства аб'ядная ўжо 500 чалавек. Будуць арганізаваны новыя брыгады вышывальшчыц у Чырвона-Слабодскім, Старобінскім, Копыльскім і Слупкім раёнах.

У 1938 годзе таварыства выпусціць рознай мастацкай вышыўкі на 200 тысяч рублёў.

ВЫДАТНЫЯ ФІЛЬМЫ ГЛЯДЗЯЦЬ КАЛГАСНІКІ

Наведваемасць кіно — адзін з паказальнікаў росту культуры працоўных. За 11 месяцаў 1937 года ў кінотэатрах Белдзяржкіно было 5.360 тысяч наведванняў гледачоў.

Асабліва вялікія поспехі дасягнуты ва ўкараненні кіно на вёсцы. Кіноперасоўкі за гэты-ж час абслужылі мільёны гледачоў. У сельскіх мясцовасцях рэспублікі працуюць 265 гукавых і нямых аўтаперасовак, якія пранікаюць у самыя аддалёныя пункты.

Сельскі кіноглядач у 1937 годзе меў магчымасць праглядзець такія выдатныя совецкія фільмы, як «Дэпутат Балтыкі», «Пётр І», «Апошняя ноч». «Цясніна аламасаў» і інш. Хутка на вясковым экране будзе дэманстравацца новы фільм Белдзяржкіно «Балтыйцы».

НОВАГОДНІ КІНОНАРЫС

Белдзяржкінохроніка прыступіла да з'ёмак для новагодняга кінонарыса. Нарыс у асноўным прысвячаецца дзецям і адлюструе сустрэчу школьнікамі зімовых канікул і свята ля новагодніх ёлак. Будуць зазняты новагодняя ёлка ў Палацы піонераў, адпачынак дзяцей у дамах адпачынку, экскурсія школьнікаў у Ленінград, спартыўныя спаборніцтвы і т. д. Кінонарыс з'явіцца на экране ў першых лічбах студзеня. Рэжысёр тав. Стрэльцоў.

СКУЛЬПТУРА А. М. ГОРКАГА

Беларускі скульптар А. В. Грубе працуе над вобразам вялікага пролетарскага пісьменніка А. М. Горкага. Скульптар ужо стварыў некалькі эскізаў статуі пісьменніка. Адзін з гэтых эскізаў-праектаў прыняты «Всекохудожником» (Масква) для ажыццяўлення вялікай манументальнай статуі А. М. Горкага. Над гэтай статуяй тав. Грубе будзе працаваць у 1938 годзе.

ЗЛЁТ СТАХАНАЎЦАЎ ХАРЧОВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ гор. МАСКВЫ

МАСКВА, 29 снежня. (БЕЛТА). 2.000 стаханаўцаў харчовых прадпрыемстваў Масквы сабраліся 28 снежня, каб абмеркаваць пытанні далейшага развіцця стаханаўскага руху і задачы 1938 года.

Маскоўскія харчавікі — перадавы атрад арміі работнікаў харчовай прамысловасці— завяршаюць 1937 год выдатнымі поспехамі. Усе буйнейшыя прадпрыемствы харчовай прамысловасці чырвонай сталіцы датэрмінова закончылі галавую праграму.

Таму з законнай гордасцю і вялікай радасцю выступалі на сходзе стаханаўцы-рабочыя, інжынеры, рапартуючы аб дасягненнях сваіх прадпрыемстваў.

З вялікай прамовай выступіў нарком харчовай прамысловасці таварыш А. І. Мікаян, сустрэты бурнымі апладысментамі. Яркая прамова таварыша Мікаяна, паставіўшага перад харчавікамі рад баявых задач, неаднаразова пераплялася шумнымі апладысментамі.

Сход звярнуўся да ўсіх работнікаў харчовай прамысловасці з заклікам — з большэвіцкай настойлівасцю і арганізаванасцю разгарнуць у 1938 годзе барацьбу за высокую социялістычную прадукцыйнасць працы, за высокаякасны рознастайны асартымент харчовых прадуктаў, зрабіць новы год годам новага магутнага ўздыму стаханаўскага руху. Сход заклікае ўсіх харчавікоў Масквы скарыстаць студзень і люты 1938 года для баявой падрыхтоўкі да правядзення ў сакавіку месячніка стаханаўскага руху. Сход паслаў прывітанне правадыру народаў таварышу Сталіну.

ПАДПІСАННЕ СОВЕЦКА-ЯПОНСКАГА ПРАТАКОЛА ПРА РЭЖЫМ РЫБАЛОЎСТВА Ў 1938 ГОДЗЕ

У адпаведнасці з дасягнутай 21 снежня гэтага года вуснай дагаворанасцю паміж совецкім і японскім урадамі, 29 снежня г.г. намеснік народнага камісара замежных спраў тав. Б. С. Стаманякоў і пасол Японіі ў СССР п. Мамору Сігеміцу падпісалі пратакол, які ўстанаўляе часовы рэжым рыбалоўства ў 1938 годзе.

(БЕЛТА).

ХРОНІКА

ЦВК СССР зацвердзіў тав. **Рыжова М. І.** народным камісарам лясной прамысловасці СССР з вызваленнем яго ад абавязкаў намесніка народнага камісара ўнутраных спраў СССР.

***

ЦВК СССР зацвердзіў тав. **Родзіна М. Н.** першым намеснікам народнага камісара лясной прамысловасці СССР.

***

ЦВК СССР вызваліў т. Гантмана Б. Н. і Когана Л. І. ад абавязкаў намеснікаў народнага камісара лясной прамысловасці СССР.

АБ НАЗНАЧЭННІ тав. ДЗМІТРЫЕВА В. І. НАРКОМАМ ЛЁГКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

ПАСТАНОВА
ПРЭЗІДЫУМА ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА БССР

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР **пастанаўляе:**

Назначыць тав. **Дзмітрыева** Владзіміра Іванавіча народным камісарам лёгкай прамысловасці БССР.

Вык. аб. старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
Н. НАТАЛЕВІЧ.

Вык. аб. сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР
А. ЕРМАК.

ПРЫГАВОР НАД КОНТРРЭВОЛЮЦЫЙНА-ШКОДНІЦКАЙ ГРУПАЙ, АРУДВАЎШАЙ У ЧАВУСКІМ РАЁНЕ

ЧАВУСЫ, 29 снежня. (Кар. «Звязды»). Сем дзён выязная сесія спецыяльнай калегіі Вярхоўнага суда БССР разбірала справу контррэволюцыйнай школьніцкай групы, якая на працягу доўгага часу арудавала ў Чавускім раёне.

Сёння, пасля сямігадзіннай нарады спецыяльнай калегіі, быў абвешчан прыгавор.

У прыгаворы канстатуецца, што ў Чавускім раёне на працягу больш трох год арудавала контррэволюцыйная група, якая ставіла сваёй мэтай падарваць эканамічную магутнасць СССР, выклікаць незадаволенне працоўных і інш.

Суд прыгазарыў Фельдмана Самуіла Ізраілевіча, Маскалёва Васілія Іларыёнавіча і Будзеля Нікалая Нікалаевіча да вышэйшай меры социяльнай абароны — расстрэлу.

Пасудны Геўрасеў Андрэй Пятровіч прысуджан да 25 год пазбаўлення волі і да 5 год пазбаўлення выбарчых правоў пасля адбыцця пакарання, Ваўчкоў Андрэй Фёдаравіч — да 15 год пазбаўлення волі і 5 год пазбаўлення выбарчых правоў пасля адбыцця пакарання.

Літвін М. П., Гурын Д. Ф., Гаўрыкаў Д. В., Булоўскі І. І., Окуневіч В. А., Кляпанаў Г. Я. асуджаны на тэрміны ад 10 да 3 год пазбаўлення волі і да рознага тэрміну пазбаўлення выбарчых правоў пасля адбыцця пакарання.

Прыгавор сустрэт адабрэннем усіх (больш 600) прысутных у зале калгаснікаў і працоўных Чавускага раёна.

Ф. КАНСТАНЦІНАЎ.

IX З'ЕЗД КОМПАРТЫІ ФРАНЦЫІ

АРЛЬ (горад на поўдні Францыі), 28 снежня. (БЕЛТА). На ўчарашнім вячэрнім пасяджэнні IX з'езда комуністычнай партыі Францыі абмяркоўваліся даклады аб дзейнасці мясцовых арганізацый партыі. Усе выступленні сведчаць аб поўнай згодзе мясцовых арганізацый з палітыкай Цэнтральнага Камітэта партыі, аб значным росце ўплыву комуністаў у прамысловых і сельскагаспадарчых раёнах.

Габрыэль Перы і дэлегат Алжыра, абвінавачваючы французскі ўрад у невыкананні сваіх абяцанняў туземцам Паўночнай Афрыкі, патрабавалі прадастаўлення палітычных правоў насельніцтву калоній і палягчэння цяжкага матэрыяльнага становішча тамашняга сялянства.

Выкрываючы проіскі фашыстаў ва французскіх калоніях, Перы заявіў: «Калі Францыя не жадае, каб ва французскай Паўночнай Афрыцы адбылося тое, што было ў Іспанскім Марока, дзе Франко з дапамогай Гітлера і Мусаліні падрыхтаваў мяцеж, французскі ўрад павінен ачысціць каланіяльную адміністрацыю і выгнаць з Паўночнай Афрыкі агентаў Гітлера і Мусаліні».

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

УСХОДНІ (арагонскі) ФРОНТ

28 снежня рэспубліканскія войскі занялі з боем будынак семінарыі ў Тэруэлі, дзе засела жменька мяцежнікаў. Супраціўленне мяцежнікаў, засеўшых у будынку грамадзянскага губернатара, значна аслабла.

Мяцежнікі атакавалі рэспубліканцаў на поўнач ад Тэруэля, але былі адбіты. Рэспубліканцы ў час гэтай аперацыі захапілі уючны транспарт праціўніка і прасунуліся ў напрамку гэры Універсалес.

Рэспубліканскія войскі занялі рад вышынь у раёне Эрміта дэ Магальон.

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

27 снежня мяцежнікі прадпрынялі дзве атакі на поўдзень ад ракі Мансанарэс, але былі адбіты.

ПАЎДНЁВЫ ФРОНТ

Рэспубліканскія войскі занялі дзве важныя пазіцыі, забяспечваючыя панаванне над наўкольным раёнам. Пазіцыі рэспубліканцаў умацаваны і знаходзяцца паміж 22—23 кілометрамі дарогі з Алькаудэтэ ў Алкала ла Рэаль.

ДЗЕЯННІ АВІЯЦЫІ

28 снежня мяцежнікі прадпрынялі два налёты на тэруэльскім участку ўсходняга фронта. У час першага налёту рэспубліканскія батарэі збілі адзін самалёт. К канцу дня цяжкія бамбардыроўшчыкі мяцежнікаў, якія з'явіліся пад прыкрыццём знішчальнікаў над пазіцыямі рэспубліканцаў паміж Сан-Блас і Тэруэлем, былі атакаваны рэспубліканскімі знішчальнікамі.

***

Пасля спробы захапіць французскі параход «Іоланта», ваенныя судны мяцежнікаў, якія аказаліся крэйсерам «Канарыяс» і кананерскай лодкай, 28 снежня бамбардыравалі Портбу, Кудера і Ла Сельва. Снарады рваліся ў горах, не прычыніўшы страты аб'ектам бамбардыроўкі.

„Трэбаль" аб рашучай барацьбе з іспанскімі трацкістамі—агентамі ворага

БАРСЕЛОНА, 28 снежня. (БЕЛТА). Орган аб'яднанай социялістычнай партыі Каталоніі «Трэбаль» друкуе рэдакцыйны артыкул, у якім выказвае глыбокае задаволенне рашэннем губернатара Валенсіі аб выключэнні членаў контррэволюцыйнай трацкісцкай ПОУМ з муніцыпалітэта (гарадскога самакіраўніцтва). Газета ўказвае, што гэта рашэнне прыводзіць у выкананне ўжо даўно высунутае настойлівае патрабаванне аб'яднанай социялістычнай партыі Каталоніі. Газета ўказвае далей, што контррэволюцыянеры-трацкісты займаюцца толькі тым, што дзейнічаюць у інтарэсах ворага, прымяняючы любыя сродкі аж да самых гнусных. Яны распаўсюджваюць хлуслівыя чуткі і арганізуюць сапраўдныя змовы супроць безапаснасці рэспублікі і яе найбольш адказных людзей. Яны прыбягаюць да самага гнуснага шпіянажа ў карысць міжнароднага фашызма.

У заключэнне газета падкрэслівае, што шпіёнаў і сабатажнікаў, працуючых у карысць мяцежнікаў, неабходна бязлітасна караць, бо толькі так могуць быць захаваны і забяспечаны свабода Іспаніі і перамога рэспублікі.

УСЕАГУЛЬНАЯ ЗАБАСТОЎКА КОМУНАЛЬНЫХ РАБОЧЫХ ПАРЫЖА

ПАРЫЖ, 29 снежня. (БЕЛТА). Сёння ў Парыжы і ва ўсім дэпартаменце Сены ўспыхнула ўсеагульная забастоўка работнікаў прадпрыемстваў комунальнай гаспадаркі—метро, аўтобусаў, электрычнасці, газавых заводаў і інш. Прычыны забастоўкі — адхіленне патрабаванняў рабочых і служачых аб павелічэнні зарплаты.

Учора вечарам адбылося пасяджэнне міжсаюзнага камітэта рабочых галін комунальнай гаспадаркі Парыжа. Быў прынят наступны зварот:

«Прэфект Сены і кіраўніцтва паліцыі ўнеслі даклад аб зарплаце рабочых і служачых комунальнай гаспадаркі. Гэты даклад, аб непрыемлемасці якога мы ўжо заяўлялі міністру ўнутраных спраў і прэфекту Сены, быў прынят большасцю парыжскага муніцыпальнага совета ў ноч з 27 на 28 снежня.

Большасць совета, па прапанове прадстаўнікоў урада, прыняла рашэнне павялічыць заработную плату работнікаў гарадской гаспадаркі толькі на 50 франкаў у месяц, г. зн. на палову таго, што прадаставіла дзяржава сваім чыноўнікам.

Гэта — сапраўдная правакацыя, якую персанал, заняты ва ўстановах і прадпрыемствах комунальнай гаспадаркі Парыжскага раёна, не можа далей цярпець, ускладаючы адказнасць за могучыя быць інцыдэнты на тых, хто гэтыя інцыдэнты выклікаў».

АДСТАЎКА РУМЫНСКАГА ЎРАДА

ЛОНДАН, 28 снежня. (БЕЛТА). Карэспандэнт агенцтва Рэйтэр паведамляе з Бухарэста, што сёння пасля прыёму ў караля румынскі прэм'ер Татарэску абвясціў, што ўзначальваемы ім урад падаў у адстаўку, паколькі ў рэзультаце апошніх выбараў у парламент ён не мае большасці ў палаце дэпутатаў.

Карэспандэнт далей указвае, што фармаванне новага кабінета даручана кіраўніку фашысцкай групы (нацыянал-хрысціянская партыя) Гога, які намеран сфармаваць урад з прадстаўнікоў усіх нацыяналістычных груповак.

Намеснік адказнага рэдактара
І. М. ОФЕНГЕЙМ.

ДЗЕННІК

30 снежня г. г. у 7 гадзін вечара ў Доме партактыва (вялікая зала) адбудзецца сход агітатараў, працаваўшых на выбарчых участках, з былымі даверанымі Кагановіцкага раёна, па пытанню замацавання агітацыйна-масавай работы сярод насельніцтва раёна.

КАГАНОВІЦКІ РК КП(б)Б.

СЁННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:

Беларускі Дзяржаўны драматычны тэатр — абан. № 82 — ВОЧНАЯ СТАЎКА. «Чырвоная зорка» — ДАЧКА РАДЗІМЫ. «Пролетарый»— ЛЕНІН У КАСТРЫЧНІКУ. Дзіцячы гукавы кінотэатр — КАРО. «Інтарнацыянал»—АНЕН. КАЎШЧЫНА. «Спартак» — АРСЕН.

НАРКАМУНУТГАНДАЛЬ БССР.
ТРЭСТ РЭСТАРАНАЎ І КАФЭ
РЫХТУЙЦЕСЯ! ДА СУСТРЭЧЫ НОВАГА ГОДА! РЫХТУЙЦЕСЯ!
31 СНЕЖНЯ — 31 СНЕЖНЯ
НА ФАБРЫЦЫ-КУХНІ
грандыёзная ілюмінаваная ЁЛКА
— Грае джаз-аркестр —
ЗАКАЗЫ НА АБСЛУГОЎВАННЕ ВЕЧАРОЎ, БАНКЕТАЎ ТАВАРЫСКІХ СУСТРЭЧ, СЯМЕЙНЫХ ВЕЧАРОЎ, ПРЫМАЮЦЬ:
ФАБРЫКА-КУХНЯ тэл. 24-462 і 25-530
РЭСТАРАН «ЕЎРОПА» тэл. 22-321
СТАЛОВАЯ № 1— Совецкая вул., тэл. 20-837
СТАЛОВАЯ № 2 — рог Совецкай і Ленінскай, тэл. 25-588.
ВА ЎСІХ РЭСТАРАНАХ
ёсць вялікі выбар кандзітарскіх вырабаў, лепшыя віны.
Новагоднія блюды прыгатаўляюцца лепшымі кулінарамі г. Менска.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Для налічэння процантаў на рахункі ўкладчыкаў, у сувязі з заканчэннем года,
Менская гарадская цэнтральная ашчадкаса № 16
і ўсе аддзяленні ашчадкасы
БУДУЦЬ ЗАКРЫТЫ
з 3 гадзін дня 31 снежня і 1 студзеня 1938 г.
2 студзеня ўсе касы БУДУЦЬ ПРАЦАВАЦЬ НАРМАЛЬНА.
АШЧАДКАСА № 16

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Менск, Совецкая, 63. ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: рэдактара — 21-352; сакратарыята — 25-188, 20-430; аддзелаў: партыйнага — 21-353, совецкага будаўніцтва і гандлю — 22-412, прамысловага 27-356, сельскагаспадарчага — 21-846, культуры — 23-955, мясцовай і замежнай інфармацыі — 25-180, аддзела пісем — 20-844, 21-880, 21-695, ілюстрацыйнага і стыльрэдактуры — 21-550, абмеру — 21-845.

Уп. Галоўлітбела № К—3203. Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая, 63. К., Л., Б.